International Accountability Platform for Belarus

Практычнае Кіраўніцтва

# ПАДЫХОД, АРЫЕНТАВАНЫ НА ПАЦЯРПЕЛЫХ, ДА ДАКУМЕНТАВАННЯ Ў МЭТАХ ПРЫЦЯГНЕННЯ ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ



Май 2025 г.

# ПАДЗЯКІ

Мы выказваем шчырую падзяку краінам і арганізацыям, якія падтрымалі Міжнародную платформу па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (ІАРВ) у яе працы па дакументаванні і расследаванні парушэнняў правоў чалавека. Яны зрабілі істотны ўнёсак у падрыхтоўку гэтай публікацыі.

Мы хацелі б асабліва адзначыць неацэнную падтрымку з боку наступных краін (пералічаныя ў алфавітным парадку): Аўстрыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, ЗША, Ірландыі, Ісландыі, Канады, Латвіі, Літвы, Ліхтэнштэйна, Нарвегіі, Нідэрландаў, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцарыі, Швецыі, Эстоніі, а таксама Еўрапейскага Саюза.

Мы таксама выказваем глыбокую ўдзячнасць нашым беларускім партнёрам, а менавіта Праваабарончаму цэнтру “Вясна” і Міжнароднаму камітэту па расследаванні катаванняў у Беларусі. Іх нязменная прыхільнасць справе падтрымкі сведак і пацярпелых, а таксама адданасць прынцыпам падыходу, арыентаванага на пацярпелых, ва ўсіх аспектах сваёй працы, маюць вырашальнае значэнне. Гэтая публікацыя была б немагчымая без іх працы.

# ЗМЕСТ

**УСТУП** 4

**КЛЮЧАВЫЯ ПРЫНЦЫПЫ АРЫЕНТАВАНАГА НА ПАЦЯРПЕЛЫХ ПАДЫХОДУ ДА ДАКУМЕНТАВАННЯ** 6

Ўзаемаадносіны з пацярпелымі 6

Прадстаўніцтва 7

Суправаджэнне 8

**ШЛЯХ ПАЦЯРПЕЛАГА ПА ПРАЦЭСЕ ДАКУМЕНТАВАННЯ** 9

**УСТАЛЯВАННЕ КАНТАКТАЎ З ПАЦЯРПЕЛЫМІ** 10

Выяўленне і лакалізацыя супольнасцяў пацярпелых і праца з імі 10

Усталяванне кантактаў з пацярпелымі і ахвярамі, фарміраванне і рэалізацыя чаканняў 11

Падтрыманне сувязі: атрыманне інфармацыі пра месцазнаходжанне пацярпелых і ахвяр 14

Інфармаванне пацярпелых аб іх правах 14

Інфармаванне пацярпелых аб бягучых судовых разглядах 16

Пашырэнне правоў і магчымасцяў пацярпелых 16

**ВЫЯЎЛЕННЕ ПАТРЭБАЎ ПАЦЯРПЕЛЫХ І АДКАЗ НА ІХ** 18

Суправаджэнне і падтрымка пацярпелых на ўсіх этапах працэсу дакументавання 18

Задавальненне патрэбаў пацярпелых з дапамогай механізмаў перанакіравання 20

**ФАРМАВАННЕ МЕТАДАЛОГІІ З УЛІКАМ ІНТАРЭСАЎ ПАЦЯРПЕЛЫХ** 20

Унутраныя пратаколы 20

Атрыманне інфармаванай згоды 21

Канфідэнцыйнасць 25

Правядзенне бяспечнага інтэрв’ю з улікам інтарэсаў пацярпелых 26

Бяспека 30

Планаванне ўстойлівага захоўвання і кіравання дадзенымі пасля завяршэння этапу актыўнага дакументавання 34

**АБАРОНА АД ДРУГАСНАЙ ТРАЎМЫ** 36

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** 37

# Уступ

## Хто мы такія?

Міжнародная платформа па прыцягненні да адказнасці для Беларусі (ІАРВ) -- гэта кааліцыя няўрадавых арганізацый, якія сумесна працуюць над дакументаваннем грубых парушэнняў правоў чалавека, здзейсненых у кантэксце прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 9 жніўня 2020 года. Створаная ў сакавіку 2021 года, Платформа збірае, правярае, захоўвае і аналізуе доказы парушэнняў, што кваліфікуюцца як злачынствы па міжнародным праве, з мэтай аказання падтрымкі нацыянальным органам крымінальнага следства, якія могуць мець юрысдыкцыю ў дачыненні да гэтых злачынстваў, і міжнародным органам па прыцягненні да адказнасці. Платформа была створана пасля публікацыі ў лістападзе 2020 года справаздачыдакладчыка Маскоўскага механізму Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), які асудзіў маштабныя катаванні, меркавана здзейсненыя беларускімі ўладамі, і заклікаў дзяржавы прыцягнуць вінаватых у катаваннях да адказнасці. Платформа ІАРВ выкарыстоўваеарыентаваны на пацярпелых і чулы да іх траўмаў падыход да збору і захавання інфармацыі і доказаў злачынстваў па міжнародным праве, здзейсненых у Беларусі.

Грамадзянская супольнасць адыгрывае вядучую ролю ў забеспячэнні прыцягнення да адказнасці за катаванні і іншыя цяжкія злачынствы ў Беларусі. Збор і захаванне доказаў мае вырашальнае значэнне для прыцягнення вінаватых да адказнасці і кампенсацыі шкоды пацярпелым, паколькі такія доказы могуць быць выкарыстаныя для забеспячэння індывідуальнай крымінальнай адказнасці ў рамках крымінальнага судаводства ў нацыянальных і міжнародных судах. Платформа цесна супрацоўнічае з пацярпелымі і іх блізкімі, якія хочуць браць удзел у гэтым працэсе і перадаюць нам свае сведчанні і дакументы аб парушэннях правоў чалавека ў Беларусі.

## Мэта

У апошнія гады ўзрасла колькасць ініцыятыў па забеспячэнні прыцягнення да адказнасці, якія ажыццяўляюцца грамадзянскай супольнасцю, што прывяло да з’яўлення новых практык, арыентаваных на патрэбы пацярпелых. Мэта гэтага Кіраўніцтва -- абагульніць досвед прымянення арыентаванага на пацярпелых падыходу да дакументавання катаванняў і іншых сур›ёзных парушэнняў правоў чалавека, а таксама зрабіць гэтыя веды даступнымі больш шырокай аўдыторыі, якая працуе ў сферы дакументавання.

## Пра што пойдзе гаворка ў гэтым Кіраўніцтве?

Гэтае Кіраўніцтва выкладае асноўныя прынцыпы прымянення падыходу, арыентаванага на пацярпелых, у дакументаванні катаванняў і іншых сур’ёзных міжнародных злачынстваў. Яно паказвае, як гэтыя прынцыпы могуць быць рэалізаваны на розных этапах працэсу дакументавання арганізацыямі грамадзянскай супольнасці ў мэтах крымінальнага пераследу, а таксама прапануе вынесеныя ўрокі і паспяховыя практыкі.

У прыватнасці, у Кіраўніцтве разглядаюцца чатыры этапы дакументавання:

## Этапы дакументавання

### Наладжванне кантактаў з пацярпелымі

- Вызначэнне і картаграфаванне супольнасцей пацярпелых
- Наладжванне кантактаў з пацярпелымі
- Вядзенне ўліку пацярпелых
- Інфармаванне пацярпелых аб іх правах
- Інфармаванне пацярпелых аб наяўных судовых разглядах

### Вызначэнне патрэб пацярпелых і рэагаванне на іх

- Суправаджэнне
- Правядзенне комплекснай ацэнкі патрэб пацярпелых
- Забеспячэнне патрэб пацярпелых праз накіраванне да адпаведных спецыялістаў

### Фарміраванне метадалогіі дакументавання з улікам інтарэсаў пацярпелых

- Рэагаванне на чаканні і іх фарміраванне
- Атрыманне інфармаванай згоды
- Канфідэнцыйнасць
- Правядзенне бяспечных і арыентаваных на пацярпелых інтэрв'ю
- Бяспека
- Пратаколы дакументавання
- Міжсектаральны падыход да дакументавання

### Абарона ад другаснай траўмы

- Прафілактыка
- Распазнаванне ранніх прыкмет вікарнай траўмы
- Рэгулярны маніторынг псіхалагічнага стану супрацоўнікаў
- Прафесійная псіхалагічная дапамога

## Метадалогія

Пры складанні дадзенага кіраўніцтва мы абапіраліся як на досвед працы Платформы IAPB з тымі, хто перанёс катаванні, і іх сем›ямі, так і на вынікі кансультацый са знешнімі экспертамі, у тым ліку арганізацый грамадзянскай супольнасці і створаных пры ААН следчых органаў, што займаюцца дакументаваннем парушэнняў міжнароднага крымінальнага права і права правоў чалавека ў розных кантэкстах. Сярод арганізацый , з якімі праводзіліся кансультацыі, -- Freedom from Torture, Trauma Treatment International (TTI), Міжнародны бесстаронні і незалежны механізм (IIIM), Міжнародны савет па рэабілітацыі ахвяр катаванняў (IRCT), Камісія па міжнародным правасуддзі і справаздачнасці (CIJA) і Незалежны следчы механізм па М'янме (IIMM).

# Ключавыя прынцыпы арыентаванага на пацярпелых падыходу да дакументавання

У гэтым Кіраўніцтве выкарыстоўваецца тэрмін survivor (той, хто перажыў [катаванні або неналежнае абыходжанне]), а не victim (ахвяра) або potential witness (патэнцыйны сведка). Хоць некаторыя людзі, якія пацярпелі ад сур’ёзных парушэнняў правоў чалавека, аддаюць перавагу тэрміну «ахвяра», звычайна выкарыстоўваецца паняцце «той, хто перажыў», каб падкрэсліць магчымасць аднаўлення і рэабілітацыі *[у гэтым дапаможніку па-беларуску будзе выкарыстоўвацца тэрмін «пацярпелы». Заўв. перакл.]*.[1] Важна ўлічваць гэтую дынаміку, паколькі існуе высокая рызыка таго, што пацярпелыя будуць адчуваць сябе маргіналізаванымі ў сувязі са сваёй роляй у крымінальным працэсе. Крымінальнае правасуддзе часта разглядаецца як пытанне, што тычыцца дзяржавы і абвінавачанага, асабліва ў тых юрысдыкцыя, дзе роля пацярпелых строга абмежаваная роляй сведак у судовым разглядзе і дзе яны не граюць актыўнай ролі.[2] Важна, каб працэс дакументавання не пагаршаў ці не спрыяў такой маргіналізацыі.

Пацярпелы -- гэта чалавек, які падвергся катаванням або іншым парушэнням правоў чалавека, а сведка -- гэта чалавек, які бачыў злачынства або валодае інфармацыяй пра яго. Гэтае адрозненне не заўсёды зразумелае, асабліва калі чалавек мае «падвойны статус», г.зн. з›яўляецца адначасова і пацярпелым, і сведкам. Сведкі-інсайдэры і сведкі-эксперты таксама могуць даць каштоўную інфармацыю ў працэсе дакументавання.

Кожны пацярпелы ад катаванняў або іншых сур›ёзных парушэнняў правоў чалавека ўнікальны, і не можа быць аднаго ўніверсальнага падыходу да працы з пацярпелымі. Аднак існуе шэраг агульных ключавых прынцыпаў, якія варта прыняць у рамках падыходу, арыентаванага на пацярпелых:

## Ўзаемаадносіны з пацярпелымі

- **Рэагаванне на патрэбы і прыярытэты пацярпелых:** Любая дзейнасць па дакументаванні павінна быць накіравана на задавальненне патрэбаў і прыярытэтаў асоб, якія пацярпелі ад катаванняў і сур›ёзных парушэнняў правоў чалавека, у тым, што тычыцца самога працэсу дакументавання, яго мэтаў і адвакацыі. У тых выпадках, калі пытанне непасрэдна закранае правы пацярпелых, іх пажаданні павінны ў максімальна магчымай ступені ўлічвацца ў межах адпаведных паўнамоцтваў органа або арганізацыі, якая ажыццяўляе дакументаванне.

1 См: УВКПЧ, *Дапаможнік па маніторынгу правоў чалавека*, раздзел 12, стар. 5; Сусветная Арганізацыя Аховы здароўя(СААЗ), Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН), Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа (МКЧК), а таксама міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, такія як Redress, Human Rights Watch, Amnesty International, «Лекары без межаў», Міжнародны савет па рэабілітацыі ахвяр катаванняў, Dignity - Дацкая інстытут супраць катаванняў, аднолькава выкарыстоўваюць гэтую тэрміналогію. Гл. REDRESS, 2022 г. *Кіраўніцтва па пытаннях правасуддзя, прыцягнення да адказнасці і кампенсацыі для пацярпелых ад катаванняў*.

2 Агенцтва Еўрапейскага Саюза па асноўных правах, 2019 г. *Правы пацярпелых як стандарты крымінальнага правасуддзя: правасуддзе для пацярпелых ад гвалтоўных злачынстваў*.

- **Не нашкодзь:** Любыя намаганні па дакументаванні павінны ажыццяўляцца ў адпаведнасці з прынцыпам «Не нашкодзь». Перад пачаткам дакументавання арганізацыі павінны забяспечыць правядзенне кантэкстуальнай комплекснай падрыхтоўкі і сумесна з пацярпелымі і партнёрамі прааналізаваць і знізіць сацыяльныя, палітычныя рызыкі і пагрозы бяспекі, звязаныя з гэтым працэсам. Гэта ўключае ў сябе прыняцце мер па забеспячэнні бяспекі асоб, якія даюць паказанні або доказы, а таксама забеспячэнне бяспекі і прыватнасці перададзеных імі дадзеных і інфармацыі. Гэта таксама прадугледжвае прыняццё мер па прадухіленні помсты, рэвікітымізацыі, рэтраўматызацыі і прыняццё дадатковых мер засцярогі ў выпадках павышанай рызыкі далейшых парушэнняў. Калі патэнцыйныя рызыкі немагчыма належным чынам знізіць, узаемадзеянне з пацярпелымі не павінна працягвацца.
- **Недыскрымінацыя:** Стаўленне да пацярпелых павінна быць справядлівым і роўным, незалежна ад іх расы, рэлігіі, палітычных перакананняў, сэксуальнай арыентацыі, гендарнай ідэнтычнасці, наяўнасці інваліднасці, мовы, ўзросту або любых іншых прыкмет або характарыстык. Выбар і выраз ідэнтычнасці пацярпелага (такія як гендар, асабістыя займеннікі і іншыя характарыстыкі) павінны паважацца і адлюстроўвацца адпаведным чынам.
- **Годнасць і спачуванне:** Усе асобы, якія ўдзельнічаюць у ініцыятыве па дакументаванні, павінны ставіцца да пацярпелых з павагай іх годнасці і спачуваннем. Гэта азначае, што супрацоўнікі павінны паводзіць сябе тактоўна, цярпліва і са спачуваннем, асабліва ў тых выпадках, калі пацярпелыя могуць адчуваць трывогу з прычыны пытанняў пра перажытае або баяцца зноў перажыць траўму, расказваючы пра яе.

## Прадстаўніцтва

- **Кіраванне чаканнямі:** Дакументатары павінны быць адкрытыя з пацярпелымі ў дачыненні да магчымых вынікаў, у тым ліку даваць інфармацыю аб знешніх фактарах, якія могуць паўплываць на гэтыя вынікі. Дакументатары павінны сумленна абмяркоўваць чаканні пацярпелых, дапамагаць ім прымаць рашэнні, заснаваныя на рэалістычных чаканнях, выразна тлумачыць, што яны могуць і чаго не могуць зрабіць, а таксама свае асабістыя і прафесійныя абмежаванні.
- **Канфідэнцыяльнасць і інфармаваная згода:** трэба паважаць і абараняць права пацярпелых на недатыкальнасць прыватнага жыцця, у тым ліку кантроль і аўтаномію ў дачыненні да сваіх паказанняў, асобы і выявы. Любая інфармацыя, атрыманая ў ходзе працэсу дакументавання, не павінна выкарыстоўвацца або перадавацца без папярэдняй задакументаванай інфармаванай згоды пацярпелага. Пацярпелыя павінны быць праінфармаваныя аб тым, што яны могуць адклікаць сваю згоду ў любы момант, пакуль інфармацыя знаходзіцца пад кантролем асоб, якія займаюцца дакументаваннем. Пасля таго як была атрыманая згода на перадачу інфармацыі нацыянальным органам або іншым органам, адказным за прыцягненне да адказнасці, асобы, якія займаюцца дакументаваннем, хутчэй за ўсё, больш не будуць мець кантроль над гэтай інфармацыяй і павінны паведаміць пра гэта пацярпелым.
- **Адказнасць:** Дакументатары павінны распрацаваць і ўкараніць працэдуры атрымання зваротнай сувязі ад пацярпелых і партнёрскіх арганізацый, каб забяспечыць захаванне прынцыпу «не нашкодзь» і павагу да патрэбаў пацярпелых у працэсе дакументавання. Пацярпелыя павінны ведаць пра існаванне механізмаў зваротнай сувязі і як яны могуць выказаць свае перасцярогі або скаргі.

## Суправаджэнне

- **Комплекснае суправаджэнне:** Дакументатары павінны прызнаваць важную ролю, праверaных грамадскіх ініцыятыў і службаў падтрымкі ў аказанні дапамогі пацярпелым і іх рэабілітацыі. Важна, каб пры неабходнасці дакументатары маглі садзейнічаць накіраванню пацярпелых у іншыя службы для забеспячэння іх дабрабыту.
- **Добраахвотны і інфармаваны ўдзел:** Працэс дакументавання павінен забяспечваць пацярпелым магчымасць актыўна прымаць інфармаваныя рашэнні аб сваім удзеле. Дакументатары павінны пастаянна аналізаваць сваё ўзаемадзеянне з пацярпелымі, у тым ліку прымаць меры для разумення і мінімізацыі дысбалансу ўлады, каб не ўплываць на рашэнні пацярпелых.
- **Планаванне дзейнасці па завяршэнні паўнамоцтваў:** Арганізацыі, якія працуюць з пацярпелымі ў мэтах дакументавання злачынстваў, павінны забяспечыць належнае планаванне далейшых дзеянняў пасля завяршэння свайго мандата і спынення свайго функцыянавання. Трэба, у прыватнасці, прадумаць, як будзе захоўвацца сабраная імі інфармацыя, хто будзе мець да яе доступ і як будзе ажыццяўляцца кіраванне гэтай інфармацыяй. У некаторых выпадках арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем парушэнняў, могуць быць адзіным кантактным пунктам для пацярпелых у іх імкненні дамагчыся прыцягнення да адказнасці асоб, вінаватых у злачынствах, учыненых супраць іх. Арганізацыі павінны прымаць меры для забеспячэння існавання кантактнага цэнтра для пацярпелых, якія далі свае паказанні або падалі інфармацыю, пасля заканчэння свайго мандата.

# Шлях пацярпелага па працэсе дакументавання

Хоць у розных арганізацыях грамадзянскай супольнасці, якія займаюцца дакументаваннем, працэсы могуць адрозніваца, прыведзеная ніжэй схема паказвае прыклад шляху пацярпелага па працэсу дакументавання:




Такім чынам, можна вызначыць ключавыя моманты для пацярпелага ў працэсе дакументавання, а арганізацыі могуць прааналізаваць, наколькі вышэйпаказаныя прынцыпы ўлічваюцца на ўсіх этапах працэсу.

# Усталяванне кантактаў з пацярпелымі

Вельмі важна, каб арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем, мелі магчымасць выйсці на пацярпелых, якія могуць падзяліцца сваім досведам з дакументатарамі. У гэты працэс звычайна ўваходзіць выяўленне і вызначэнне месцаў пражывання супольнасцяў пацярпелых, а таксама правядзенне працы па ўсталяванні кантактаў з імі, наладжванню адносін і заахвочванню іх удзелу ў працэсе дакументавання. Ад таго, наколькі эфектыўна вядзецца гэтая праца, у значнай ступені залежыць даступнасць працэдур правасуддзя для шырокіх груп пацярпелых, у тым ліку асоб ва ўразлівым становішчы, структурна неабароненых груп і супольнасцяў, якія часам аказваюцца ў баку ад працэсаў прыцягнення да адказнасці.

Выхад на пацярпелых і першы кантакт з імі павінны ажыццяўляцца з улікам перанесенай імі траўмы, гэта значыць, арганізацыі павінны ўсведамляць, што ў пацярпелых могуць быць асаблівыя патрэбы ў выніку перанесенай траўмы. Траўма ўплывае на пацярпелых па-рознаму, і гэты ўплыў павінны быць добра зразумелы дакументатарам, з тым каб можна было прыняць меры для выяўлення і змякчэння патэнцыйнай рэтраўматызацыі ў ходзе працэсу дакументавання. Падыход з улікам перанесенай траўмы з›яўляецца ключавым элементам прынцыпу «не нашкодзь». Перш чым дакументатары пачнуць кантактаваць з пацярпелымі, супрацоўнікі, якія ўдзельнічаюць у гэтым працэсе, павінны набыць неабходныя навыкі для працы з людзьмі, якія перажылі траўму.

## Выяўленне і лакалізацыя супольнасцяў пацярпелых і праца з імі

Многія пацярпелыя звяртаюцца ў арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем, пасля таго як знаходзяць інфармацыю ў Інтэрнэце, у сацыяльных сетках або падчас публічных мерапрыемстваў. Таму важна, каб інфармацыя пра ініцыятыву па дакументаванні была лёгка даступная для пацярпелых, у тым ліку праз сродкі масавай інфармацыі (радыё, тэлебачанне) і анлайн-крыніцы (сацыяльныя сеткі) на мовах і ў тэрміналогіі, зразумелых розным групам пацярпелых.

У многіх выпадках пацярпелыя могуць быць накіраваныя ў арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем, іншымі пацярпелымі, службамі падтрымкі пацярпелых або арганізацыямі грамадзянскай супольнасці. Карысна правесці працу па выяўленні арганізацый, якія аказваюць падтрымку пацярпелым, і іншых АГС, якія могуць знаходзіцца ў прамым кантакце з пацярпелымі. Наладжванне адносін і ўсталяванне даверу з суб›ектамі, выяўленымі ў ходзе гэтай працы, у тым ліку іншымі арганізацыямі і ініцыятывамі, якія прадстаўляюць розныя супольнасці пацярпелых (такія як жаночыя групы), таксама можа дапамагчы ва ўсталяванні кантактаў з пацярпелымі, якія ў адваротным выпадку не мелі б магчымасці звязацца з дакументатарамі.[3] Дзякуючы такім намаганням пацярпелыя, якія карыстаюцца паслугамі падтрымкі, што прапануюцца іншымі арганізацыямі, або ўдзельнічаюць у групах узаемадапамогі, могуць атрымаць інфармацыю аб працэсах правасуддзя і спосабах удзелу ў іх.

3 Кансультацыі, праведзеныя REDRESS ў красавіку 2023 г.

Дакументатары павінны **наўпрост** ўзаемадзейнічаць з пацярпелымі, каб выявіць і ліквідаваць перашкоды для іх магчымага ўдзелу ў дакументаванні і больш шырокіх працэсах правасуддзя: напрыклад, праводзіць інфармацыйную дзейнасць, арганізоўваць онлайн-мерапрыемствы для тлумачэння канкрэтных аспектаў працэсаў правасуддзя або распаўсюджваць кароткія матэрыялы з тлумачэннем сваёй працы і указаннем бяспечных спосабаў сувязі з імі.

Па магчымасці, **сходы пацярпелых** або іншыя мерапрыемствы, на якіх прысутнічаюць групы пацярпелых, таксама могуць стаць карыснай пляцоўкай для інфармавання супольнасцяў аб працы арганізацыі.

## Усталяванне кантактаў з пацярпелымі і ахвярамі, фарміраванне і рэалізацыя чаканняў

**Інфармаваны ўдзел.** Калі пацярпелыя ўступаюць у кантакт з арганізацыяй, якая займаецца дакументаваннем міжнародных злачынстваў, ім павінна быць прадастаўлена вычарпальная інфармацыя, якая дазваляе ім прыняць інфармаваныя рашэнне пра свой удзел.

**Падыход з улікам перанесенай траўмы.** Дакументатары мусяць заўсёды памятаць, што ўдзел пацярпелых у любым праекце па дакументаванні часта спалучаны з неабходнасцю зноў узгадваць вельмі траўматычныя падзеі і можа стварыць для іх дадатковую рызыку рэпрэсій з боку ўладаў. Таму дакументатары павінны забяспечваць адпаведныя меры засцярогі, каб прадухіліць рэтраўматызацыю і рэвіктымізацыю, а таксама мінімізаваць пагрозы бяспецы, дзейнічаючы ў адпаведнасці з прынцыпам «не нашкодзь». Гэта трэба рабіць з самага першага кантакту, яшчэ да правядзення інтэрв›ю з пацярпелым.  Таму пры распрацоўцы стратэгій першага кантакту з пацярпелымі можа быць карысна прыцягнуць да гэтай працы арганізацыі, якія спецыялізуюцца на аказанні падтрымкі пацярпелым, або спецыялістаў у галіне псіхічнага здароўя.

**Фарміраванне чаканняў.** Найважнейшай часткай першага кантакту з пацярпелымі з›яўляецца фарміраванне і абмеркаванне іх чаканняў.  Няздольнасць належным чынам адрэагаваць на чаканні пацярпелых у дачыненні да іх удзелу ў працэсе дакументавання і кіраваць гэтымі чаканнямі можа стварыць рызыку адмовы ад удзелу, паколькі пацярпелыя могуць хутка расчаравацца ў працэсе прыцягнення да адказнасці, які можа ісці вельмі павольна ці ўвогуле не рухацца.  Прадастаўленне пацярпелым падрабязнай і вычарпальнай інфармацыі дапаможа ім ацаніць рызыкі і прыняць інфармаванае рашэнне аб магчымым удзеле ў дзейнасці органаў па прыцягненню да адказнасці і органаў крымінальнага правасуддзя.

Абмяркоўваючы з пацярпелымі іх чаканні, дакументатары павінны расказаць ім аб магчымых шляхах прыцягнення вінаватых да адказнасці, пра тое, колькі часу гэта можа заняць, аб розных спосабах выкарыстання пададзенай інфармацыі, аб прыватнасці і рызыках для пацярпелых.  Важна не ствараць у іх неапраўданых чаканняў, асабліва ў дачыненні да пытанняў, якія знаходзяцца па-за кантролем арганізацыі, такіх як ўзбуджэнне нацыянальных або міжнародных крымінальных расследаванняў або магчымасць атрымання кампенсацыі

ў будучыні, паколькі гарантый у гэтым выпадку няма.[4] Каб кіраваць чаканнямі ў працэсе дакументавання, арганізацыям варта разгледзець магчымасць прыняцця наступных мер:

- У пачатку інтэрв›ю выразна растлумачце свае паўнамоцтвы і мэты, якія пераследуе ваша арганізацыя (напрыклад, дакументаванне злачынстваў для прыцягнення вінаватых да адказнасці ў будучыні), а таксама перашкоды на шляху да прыцягнення вінаватых да адказнасці ў кароткатэрміновай перспектыве (напрыклад, бягучая палітычная сітуацыя ў краіне, дзе былі здзейсненыя злачынствы; адсутнасць дзейсных механізмаў правасуддзя).[5]
- Растлумачце паўнамоцтвы тых структур, якім вы можаце перадаць паказанні, а таксама магчымыя наступствы такой перадачы інфармацыі.[6] Выразна патлумачце, чаго можна ў рэальнасці чакаць ад такіх працэсаў.
- У любой камунікацыі з пацярпелымі пераканайцеся, што яны разумеюць ужываныя вамі словы і паняцці.
- Пераканайцеся, што пацярпелыя разумеюць, ці варта ім чакаць далейшых кантактаў з боку вашай арганізацыі, як такія кантакты могуць адбывацца і чаго яшчэ яны могуць і не могуць чакаць ад вас. Растлумачце, як пацярпелыя могуць звязацца з арганізацыяй, калі ў іх узнікнуць пытанні адносна працэсу прыцягнення да адказнасці або іншых аспектаў.[7]
- Пераканайцеся, што пацярпелыя разумеюць сваю ролю ў працэсе і што ад іх чакаецца.
- Калі арганізацыя-дакументатар звязваецца з пацярпелым ўпершыню, трэба выразна патлумачыць, якім чынам была атрымана кантактная інфармацыя пацярпелага. Гэта асабліва важна ў сітуацыях, калі пацярпелыя не давяраюць уладам і/або знаходзяцца ў сітуацыі, якая пагражае іх бяспецы.
- Калі першы кантакт з пацярпелым не з›яўляецца вочным, варта пазбягаць абмеркавання адчувальнай інфармацыі і траўматычнага мінулага. У гэтым выпадку камунікацыя павінна быць засяроджана на прадстаўленні арганізацыі і яе паўнамоцтваў, усталяванні даверу, праверцы бягучай бяспекі пацярпелага, калі гэта неабходна, і арганізацыі далейшых кантактаў.

Вышэйапісаныя крокі могуць дапамагчы пацярпелым ясна зразумець, як можа быць выкарыстана прадстаўленая імі інфармацыя і да якіх вынікаў гэта можа прывесці. Пасля ўдакладнення рэалістычных чаканняў важна, каб дакументатары былі гатовыя падтрымаць пацярпелых у прыняцці інфармаваных рашэнняў і паважалі іх выбар на працягу ўсяго працэсу ўзаемадзеяння.[8] Для гэтага неабходна быць гатовым адкрыта адказваць на любыя пытанні ці неаднаразова вяртацца да некаторых з гэтых аспектаў, калі відаць, што чалавек нешта не так зразумеў.

4 Public International Law & Policy Group, 2016 г. *Кіраўніцтва па дакументаванні сур'ёзных парушэнняў правоў* чалавека грамадзянскай супольнасцю.
5 Семінар REDRESS па падыходзе, арыентаваным на пацярпелых, снежань 2022 г.
6 Public International Law & Policy Group, 2016 г. *Кіраўніцтва па дакументаванні сур'ёзных парушэнняў правоў* чалавека грамадзянскай супольнасцю.
7 Семінар REDRESS па падыходзе, арыентаваным на пацярпелых, снежань 2022 г.
8 Глабальны кодэкс паводзінаў па зборы і выкарыстанні інфармацыі аб сістэматычным і звязаным з канфліктамі сэксуальным гвалце, (Кодэкс Мурад), 2022 г.

# Першы кантакт з пацярпелымі

- **Пераканайцеся, што сувязь усталявана бяспечным спосабам**
- **Дакладна патлумачце ролю і мэты вашай арганізацыі**
- **Патлумачце ўсе тэрміны, якія могуць выклікаць непаразуменне (напрыклад, крымінальная адказнасць, дакументаванне)**
- **Патлумачце магчымыя рызыкі, з якімі можа сутыкнуцца пацярпелы, і як ваша арганізацыя можа іх зменшыць**

Спосаб абмену інфармацыяй з пацярпелымі будзе ў значнай ступені залежаць ад кантэксту і абставін кожнага асобнага выпадку. Аднак прадастаўленне гэтых матэрыялаў у пісьмовай форме рэдка будзе дастатковым (а ў тых выпадках, калі захоўванне пісьмовых матэрыялаў можа прадстаўляць рызыку для пацярпелага, нават непажаданым). Арганізацыям трэба прымаць меры для таго, каб гэтая інфармацыя прадстаўлялася ў зразумелай і актуальнай для пацярпелых форме. Напрыклад, Незалежны следчы механізм па М›янме (IIMM) падкрэсліў той факт, што многія з асоб, з якімі ён узаемадзейнічае, не знаёмыя з судовым працэсам, і распавёў пра ўжыванне метаду ролевых гульняў як сродку, які дазваляе пацярпелым лепш зразумець, што можа пацягнуць за сабой удзел у працэсе дакументавання і любых наступных мерах па прыцягненні да крымінальнай адказнасці.[9]

Яшчэ адным важным пытаннем, якое варта разгледзець на этапе ўстанаўлення кантактаў і фарміравання чаканняў, з›яўляецца стварэнне механізму зваротнай сувязі, якім пацярпелыя могуць скарыстацца на любым этапе працэсу. У адпаведнасці з кіруючым прынцыпам адказнасці (гл. раздзел «Ключавыя прынцыпы»), стварэнне механізму зваротнай сувязі з'яўляецца крокам, накіраваным на забеспячэнне выканання дакументуючай арганізацыяй сваіх абавязацельстваў. Рэгулярны збор, аналіз і ўлік зваротнай сувязі могуць дапамагчы зрабіць працэс дакументавання больш уважлівым да патрэбаў пацярпелых і ў большай ступені адлюстроўваць гэтыя патрэбы.[10] Дакументатары павінны інфармаваць пацярпелых пра існаванне такога механізму і пра тое, як яго можна выкарыстоўваць для прадастаўлення зваротнай сувязі. Пацярпелым варта, па магчымасці, забяспечваць умовы для ананімнай зваротнай сувязі з выкарыстаннем бяспечных і дарэчных для канкрэтнай сітуацыі спосабаў, такіх як тэлефонны званок або онлайн-форма.

9 Кансультацыі, праведзеныя REDRESS ў красавіку 2023 г.

10 Глабальны кодэкс паводзінаў па зборы і выкарыстанні інфармацыі аб сістэматычным і звязаным з канфліктамі сэксуальным гвалце, (Кодэкс Мурад), 2022 г., пункт 8.8

## Падтрыманне сувязі: атрыманне інфармацыі пра месцазнаходжанне пацярпелых і ахвяр

Прыцягненне да адказнасці заўсёды з›яўляецца доўгім працэсам. Магчыма, з пацярпелымі неабходна будзе звязацца праз шмат гадоў пасля таго, як яны ўпершыню падалі інфармацыю. У той жа час можа здарыцца так, што судовыя органы так і не звяжуцца з пацярпелым. Падтрыманне сувязі з пацярпелымі -- асабліва складаная задача, паколькі яны могуць неаднаразова мяняць сваё месцазнаходжанне ў сілу розных фактараў (напрыклад, візавых правілаў, пагроз бяспекі, узброеных канфліктаў або асабістых абставінаў).

Важна забяспечыць, каб арганізацыі фіксавалі актуальную інфармацыю пра месцазнаходжанне пацярпелых з мэтай пастаяннага абнаўлення і актуалізацыі згоды па меры неабходнасці, а таксама інфармавалі пацярпелых аб ключавых падзеях у працы адпаведных нацыянальных органаў на больш позьнім этапе. Гэта можна зрабіць, прадугледзеўшы ў формах інтэрв›ю магчымасць для дакументатараў збіраць кантактную інфармацыю пацярпелых і іх блізкіх. Сюды можа ўваходзіць любая інфармацыя, якая можа дапамагчы следчым звязацца з чалавекам праз некалькі гадоў.[11]

У кароткатэрміновай перспектыве прызначэнне для кожнага пацярпелага асобнай кантактнай асобы з арганізацыі (напрыклад, інтэрв›юера, следчага і т.д.) таксама можа дапамагчы пазбегнуць сітуацый страты кантакту. У выпадках, калі пацярпелыя маюць такую кантактную асобу для сувязі, яны з большай верагоднасцю паведамяць арганізацыі аб пераездзе або змене нумара тэлефона, паколькі паміж імі і кантактнай асобай будуецца давер.

Яшчэ адна магчымая стратэгія, якая дазваляе пазбегнуць страты сувязі з пацярпелымі, заключаецца ў правядзенні рэгулярных праверак з выкарыстаннем бяспечных сродкаў сувязі, такіх як абароненыя месэнджэры або зашыфраваныя электронныя лісты. Рэгулярныя кантакты з пацярпелымі могуць быць не толькі магчымасцю нагадаць ім пра важнасць абнаўлення сваіх кантактных дадзеных і месцазнаходжання ў выпадку якіх-небудзь зменаў, але і спосабам абмену інфармацыяй і апошнімі навінамі пра падзеі, звязаных з правасуддзем і прыцягненнем да адказнасці. Такія праверкі могуць праводзіцца штогод або часцей, напрыклад, кожныя шэсць месяцаў.

## Інфармаванне пацярпелых аб іх правах

Міжнароднае права ў галіне правоў чалавека прызнае, што асобы, правы якіх былі парушаныя, павінны мець права на эфектыўныя сродкі прававой абароны.[12] Пацярпелыя таксама маюць права на атрыманне інфармацыі, на абарону ад запалохвання і помсты, а таксама на пакрыццё шкоды.[13] Гэтыя правы замацаваны ў міжнародных дамовах, і абавязак па іх ажыццяўленню ляжыць на дзяржавах-удзельніцах. Акрамя таго,

11 Кансультацыі, праведзеныя REDRESS ў сакавіку 2023 г.

12 Гл., напрыклад, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах(МПГПП), арт.2 (3).

13 Гл., напрыклад, Канвенцыю супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання, арт. 13-14; Міжнародную канвенцыю для абароны ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў, арт.12, 15, 24. Гл. таксама даклад Камісіі міжнароднага права, Праекты артыкулаў аб прадухіленні злачынстваў супраць чалавечнасці і пакаранні за іх (Раздзел IV).

дзяржавы-члены ЕС абавязаны забяспечыць ажыццяўленне правоў, прадугледжаных у дырэктыве ЕС аб правах ахвяр злачынстваў. Дырэктыва ўстанаўлівае мінімальныя стандарты ў дачыненні да правоў, падтрымкі і абароны ахвяр злачынстваў у Еўрасаюзе. Яна прадугледжвае правы пацярпелых і членаў іх сем›яў на інфармацыю, належную падтрымку і абарону, а таксама ўмацоўвае працэсуальныя правы пацярпелых у крымінальным судаводстве.[14]

Добрай практыкай з›яўляецца інфармаванне пацярпелых аб іх правах у адпаведных судовых разглядах. З практычнага пункту гледжання гэта можа быць цяжка зрабіць, паколькі арганізацыі часта не ў стане прадказаць, якія дзяржавы або органы возьмуцца за ажыццяўленне юрысдыкцыі і выканаюць свае абавязацельствы перад пацярпелымі і сведкамі. Акрамя таго, правы пацярпелых і іх рэалізацыя на практыцы могуць значна адрозніваццa ў залежнасці ад канкрэтнай юрысдыкцыі або органа, адказнага за прыцягненне да адказнасці. Таму, у выпадку адсутнасці такой інфармацыі, можна даць агульную інфармацыю аб правах пацярпелых і пра тое, што яны могуць азначаць, напрыклад, пра права на прававую абарону і пакрыццё шкоды.

Пацярпелыя, якія дамагаюцца прыцягнення да адказнасці ў краінах ЕС (напрыклад, у адпаведнасці з прынцыпам універсальнай юрысдыкцыі або ў выпадку, калі дзяржава-член ЕС мае іншую падставу для расследавання і пераследу), павінны, як мінімум, быць азнаёмленыя са сваімі правамі ў адпаведнасці з Дырэктывай аб правах ахвяр злачынстваў, паколькі гэтая дырэктыва з›яўляецца абавязковай для ўсіх дзяржаў-членаў ЕС. Гэтыя правы ўключаюць наступнае:

## Правы карміцеля

### Права на інфармацыю і падтрымку

- Права на атрыманне інфармацыі з моманту першага кантакту
- Права на атрыманне інфармацыі аб сваёй справе
- Права на вусны і пісьмовы пераклад
- Права на доступ да паслуг падтрымкі пацярпелых

### Права на ўдзел у крымінальным судовым працэсе

- Права быць выслуханым і прадстаўляць доказы ў межах крымінальнага судовага разгляду
- Права на гарантыі абароны ад запалохвання і помсты падчас крымінальнага судовага працэсу
- Права на юрыдычную дапамогу
- Права на прынясце рашэння аб кампенсацыі

### Права на абарону

- Права на абарону ад запалохвання і помсты, у тым ліку ад рызыкі эмацыйнай або псіхалагічнай шкоды
- Права на абарону прыватнага жыцця
- Права на абарону пацярпелых, якія маюць асаблівыя патрэбы ў абароне

14 Дырэктыва 2012/29 EU Еўрапейскага парламента і Савета ад 25 кастрычніка 2012 г.

Хоць забеспячэнне захавання гэтых правоў з›яўляецца абавязкам дзяржавы, арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем, могуць граць важную ролю ў інфармаванні пацярпелых аб іх правах. Арганізацыі павінны забяспечыць тлумачэнне гэтых правоў пацярпелым і маглі б прыкласці намаганні для падрыхтоўкі і распаўсюджвання матэрыялаў, якія дазволілі б данесці інфармацыю даступным чынам і на даступных ім мовах.

## Інфармаванне пацярпелых аб бягучых судовых разглядах

Інфармаванне пацярпелых аб бягучых судовых разглядах можа быць складанай задачай, асабліва калі працэсы правасуддзя зацягваюцца на гады.  Акрамя таго, часта арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем, могуць не ведаць аб усіх бягучых расследаваннях або аб іх статусе, паколькі нацыянальныя праваахоўныя органы могуць не публікаваць такую інфармацыю.  Аднак, арганізацыі павінны прыкладаць разумныя намаганні, каб максімальна надаваць інфармацыю пра такія працэсы пацярпелым і адпаведным супольнасцям.  З улікам гэтых практычных цяжкасцяў арганізацыям варта надаваць прыярытэтную ўвагу распаўсюду інфармацыі аб ключавых падзеях, якія могуць даць адчуванне справядлівасці больш шырокім колам закранутых супольнасцяў, напрыклад, пра вынясенне знакавага рашэння па справе, якая разглядаецца ў рамках універсальнай юрысдыкцыі ў канкрэтнай юрысдыкцыі, або пачатак расследавання пракурорам Міжнароднага крымінальнага суда.  Гэта варта рабіць з выкарыстаннем розных каналаў інфармавання ў фармаце і на мове, якія лёгка зразумелыя пацярпелым.

У залежнасці ад канкрэтнай юрысдыкцыі пацярпелыя, якія маюць статус пацярпелых ва ўзбуджаных справах, маюць права на атрыманне інфармацыі аб ходзе разбіральніцтва па справе. Хоць абавязак прадастаўляць такую інфармацыю ўскладзена на нацыянальныя органы, дакументатары павінны, па магчымасці, інфармаваць пацярпелых аб гэтым праве.

## Пашырэнне правоў і магчымасцяў пацярпелых

Пацярпелыя ад парушэнняў правоў чалавека часта не маюць рэсурсаў і магчымасцяў для таго, каб іх галасы былі пачутыя і каб стаць рухавіком працэсаў прыцягнення да адказнасці.[15] У выніку пацярпелыя могуць быць пазбаўленыя матывацыі для працягу судовых працэсаў і ўдзелу ў іх, асабліва ў тых выпадках, калі дасягненне справядлівасці займае дзесяцігоддзі, а асноўныя вінаватыя ў парушэннях правоў чалавека і нормаў міжнароднага крымінальнага права застаюцца пры ўладзе.  Арганізацыі, якія займаюцца дакументаваннем, павінны граць актыўную ролю ў стварэнні ўмоў для пашырэння правоў і магчымасцяў пацярпелых у мэтах дасягнення правасуддзя і прыцягнення да адказнасці шляхам уключэння ў сваю працу стратэгій пашырэння правоў і магчымасцяў пацярпелых.

15 Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR), студзень 2020 г. *Умацаванне суб›ектнасці пацярпелых ад міжнародных злачынстваў*, ст.1.

Пашырэнне правоў і магчымасцяў пацярпелых спрыяе развіццю іх унутраных рэсурсаў шляхам палягчэння іх доступу да шырокага спектру паслуг па аказанні падтрымкі і прадастаўлення ім магчымасцяў для ўмацавання ўласнага патэнцыялу, стварэння сетак падтрымкі і ажыццяўлення дзеянняў па ўласным выбары.[16] Пашырэнне правоў і магчымасцяў можна вызначыць як валоданне кантролем, магчымасць быць пачутым і прызнаным, а таксама павага выбару чалавека іншымі людзьмі.[17] Удзел пацярпелых з›яўляецца важным элементам узмацнення іх суб›ектнасці, што азначае, што пацярпелыя павінны мець магчымасць удзельнічаць у працэсах, накіраваных на пашырэнне іх правоў і магчымасцяў.

Важна, каб стратэгіі пашырэння правоў і магчымасцяў пацярпелых былі накіраваны на іх удзел не толькі ў судовых працэсах, але і ў іншых мерапрыемствах, такіх як адвакацыя або правядзенне кампаній. Улічваючы, што ўзбуджэнне спраў у рамках універсальнай юрысдыкцыі ці іншых судовых разглядаў можа адбывацца праз шмат гадоў пасля здзяйснення парушэнняў, правядзенне такіх мерапрыемстваў, як адвакацыя або арганізацыя кампаній, якія могуць спрыяць дасягненню іншых відаў справядлівасці на прамежкавым этапе або, па меншай меры, прыцягнуць увагу да парушэнняў, можа дапамагчы пацярпелым аднавіць пачуццё кантролю над сваім жыццём і адчуць, што яны былі пачутыя.

Ключавыя элементы стратэгій пашырэння правоў і магчымасцяў пацярпелых уключаюць:

- **Комплексную падтрымку:** Патрэбы пацярпелых павінны ўлічвацца для таго, каб яны маглі адыгрываць актыўную ролю ў працэсах прыцягнення да адказнасці, калі яны самі гэтага жадаюць.

- **Празрыстую камунікацыю:** Камунікацыя мае ключавое значэнне з моманту першага кантакту з пацярпелымі і супольнасцямі, закранутымі гвалтам. Для падтрымання камунікацыі ў доўгатэрміновай перспектыве арганізацыі могуць разгледзець, пры ўмове папярэдняй ацэнкі бяспекі, такія рашэнні, як правядзенне рэгулярных сустрэч з пацярпелымі або стварэнне рэгулярнага інфармацыйнага бюлетэня з апошнімі навінамі аб бягучых працэсах, пры гэтым улічваючы меркаванні (кібер)бяспекі.[18] Бяспечныя прасторы для камунікацыі павінны дазваляць пацярпелым дзяліцца сваімі ідэямі і вопытам і спрыяць ўзаемадзеянню на роўных, з разуменнем і павагай да іх суб›ектнасці.

  Неабходна наладзіць канструктыўнае ўзаемадзеянне не толькі з пацярпелымі, што непасрэдна ўдзельнічаюць у працы па дакументаванні (ці іншай працы арганізацыі), але і з больш шырокімі групамі пацярпелых на нізавым узроўні.

- **Рэагаванне на чаканні:** Пацярпелыя павінны ведаць, якія меры магчымыя, а якія — не, і разумець існуючыя абмежаванні.

16 УВКПЧ, 2009 г. Асноўныя напрамкі нацыянальнай палітыкі па ўмацаванні ролі пацярпелых, ст. 3.
17 Там жа.
18 УВКПЧ, 2009 г. Асноўныя напрамкі нацыянальнай палітыкі па ўмацаванні ролі пацярпелых, ст. 6.

- **Не нашкодзь:** Імкнучыся да пашырэння правоў і магчымасцяў пацярпелых, арганізацыі павінны памятаць пра свой абавязак выконваць прынцып «Не нашкодзь» і абмяркоўваць такія фактары, як, напрыклад, магчымыя наступствы публічных выступаў у СМІ. Можна разгледзець магчымасць правядзення адпаведнага навучання для пацярпелых, якія вырашылі ўдзельнічаць у публічнай абароне правоў, а таксама падрыхтоўкі і інфармавання іх сваякоў, якія могуць сутыкнуцца з наступствамі такой працы.

- **Удзел:** Пацярпелыя павінны мець магчымасць у поўнай меры ўдзельнічаць у працэсе прыцягнення да адказнасці. а не толькі ў якасці пацярпелых або сведак у мэтах дакументавання або судовага разбіральніцтва. Гэта можа ўключаць удзел у распрацоўцы стратэгій прыцягнення да адказнасці і звязанай з гэтым адвакацыі. Арганізацыя, якая займаецца дакументаваннем, павінна забяспечыць прыняццё канкрэтных і адпаведных кантэксту мер для ўключэння пацярпелых і прадастаўлення ім магчымасці ўдзельнічаць на розных этапах працэсу дакументавання. Асаблівую ўвагу варта надаваць гістарычна маргіналізаваным групам і асобам, якія знаходзяцца ва ўразлівым становішчы.

# Выяўленне патрэбаў пацярпелых і адказ на іх

## Суправаджэнне і падтрымка пацярпелых на ўсіх этапах працэсу дакументавання

*Суправаджэнне* Імкненне да правасуддзя можа быць карысным і гаючым для пацярпелых і стаць важным кампанентам працэсу аднаўленняпасля траўматычнага досведу катаванняў або іншых парушэнняў правоў чалавека.[19] Аднак узаемадзеянне з органамі, адказнымі за прыцягненне да адказнасці, і судовымі органамі можа быць спалучана са стрэсам і нават прывесці да рэтраўматызацыі. Дамагчыся прыцягнення да адказнасці нялёгка па шэрагу прычын, у тым ліку такіх, як адсутнасць даступных прававых механізмаў, працяглыя і складаныя працэдуры, адсутнасць гарантый кампенсацыі шкоды і неабходнасць зноў распавядаць пра перанесеныя катаванні або іншую шкоду на розных этапах працэсу. Гэта толькі некаторыя з прычын, па якіх пацярпелыя маюць патрэбу ў комплекснай падтрымцы і суправаджэнні на працягу ўсяго працэсу.[20] Суб›екты, якія ўдзельнічаюць у працы па дакументаванні, павінны суправаджаць пацярпелых на працягу ўсяго працэсу. На практыцы суправаджэнне можа ўключаць:

- Прадастаўленне пацярпелым магчымасці выказаць свае чаканні і прыярытэты;
- Прадастаўленне экспертных ведаў і кансультацый для аказання падтрымкі пацярпелым у прыняцці рашэнняў, звязаных з працэсам прыцягнення да адказнасці, з тым каб пацярпелыя маглі зрабіць свядомы выбар у дачыненні да свайго ўдзелу ў патэнцыйных і бягучых працэсах правасуддзя.

19 REDRESS, 2022 г. *Кіраўніцтва па пытаннях правасуддзя, прыцягнення да адказнасці і кампенсацыі шкоды для асоб, якія перажылі катаванні*.
20 REDRESS, 2021 г. *Практычная запіска: комплексны стратэгічны судовы пераслед за катаванні*.

Суправаджэнне таксама патрабуе забеспячэння доступу пацярпелых да паслуг медыцынскай і псіхасацыяльнай падтрымкі. Для вызначэння таго, якая падтрымка можа спатрэбіцца пацярпеламу, варта правесці комплексную ацэнку яго патрэбаў, як толькі дакументатары ўступяць з ім у кантакт.  Такая ацэнка павінна ўлічваць любыя патрэбы пацярпелага ў медыцынскай, сацыяльнай і псіхалагічнай падтрымцы. Вельмі важна надаць увагу пытанням абароны дадзеных і бяспекі (падрабязней гл. ў раздзелах «Канфідэнцыйнасць» і «Бяспека» ніжэй).

Хаця ў працэсе комплекснай ацэнкі важна фіксаваць патрэбы пацярпелых, супрацоўнікі таксама павінны старанна тлумачыць ім свае магчымасці і магчымыя абмежаванні ў сваіх дзеяннях, каб не ствараць неапраўданых чаканняў. Супрацоўнікі таксама павінны памятаць пра патрабаванні ў дачыненні да абароны дадзеных у сваёй юрысдыкцыі і атрымаць згоду пацярпелага на дакументаванне праведзенай ацэнкі. Больш падрабязная інфармацыя аб правілах абароны дадзеных прыводзіцца ў пункце 57. У выпадках, калі патрэбы не могуць быць задаволеныя з дапамогай наяўных рэсурсаў або існуючых каналаў для накіравання да іншых спецыялістаў, арганізацыя павінна шукаць магчымасці для развіцця свайго патэнцыялу або стварэння адпаведных сетак, каб мець магчымасць задаволіць гэтыя патрэбы ў будучыні.

*Індывідуальная ацэнка.* Любая ацэнка патрэбаў пацярпелага павінна ўлічваць розныя індывідуальныя фактары і сацыяльны кантэкст і не грунтавацца на загадзя сфармаваных уяўленнях аб тым, што складае ўразлівасць чалавека (напрыклад, выключна на падставе полу або перанесенай траўмы). Не існуе універсальнага падыходу да правядзення такой ацэнкі, і яе аб›ём можа залежаць ад магчымасцяў арганізацыі.  Напрыклад, некаторыя арганізацыі могуць выкарыстоўваць стандартызаваны апытальнік ў якасці кіраўніцтва для правядзення ацэнкі. Такі падыход асабліва карысны, калі ацэнку праводзяць асобы, якія не маюць спецыяльнай падрыхтоўкі ў галіне наступстваў пэўных злачынстваў. У якасці альтэрнатывы, гутарка без загадзя падрыхтаванага сцэнара пад кіраўніцтвам спецыяліста, які прайшоў падрыхтоўку па пытаннях асаблівых наступстваў катаванняў і іншых сур›ёзных парушэнняў правоў чалавека для пацярпелых, часта прыводзіць да лепшых вынікаў і можа ўспрымацца пацярпелым як не такая фармальная. Важна, каб супрацоўнікі прайшлі падрыхтоўку ў галіне выяўлення патрэбаў пацярпелых і правядзення такой ацэнкі.

Ацэнка можа ўключаць у сябе наступнае:

- агульная інфармацыя аб пацярпелым, у тым ліку імя, гендар, дату нараджэння і кантактныя дадзеныя;
- камунікацыйныя патрэбы пацярпелага, у тым ліку мовы, на якіх ён размаўляе, і наяўнасць інваліднасці або абмежаванняў (напрыклад ,калі пацярпелы не ўмее чытаць і пісаць, гэтая інфармацыя павінна быць зафіксавана);
- кароткі выклад парушэнняў правоў чалавека, ад якіх ён пацярпеў
- інфармацыя пра тое, ці захоўваецца пагроза бяспецы пацярпелага;
- Уздзеянне парушэнняў правоў чалавека на пацярпелага і яго сям›ю, у тым ліку медыцынскія, псіхалагічныя і сацыяльныя наступствы, а таксама інфармацыя аб тым, ці прымаюцца меры для іх ліквідацыі і ў якой ступені;
- Патэнцыйныя меры абароны або падтрымкі, на якія ёсць запыт у пацярпелага.

Вельмі важна, каб гэтыя патрэбы былі зафіксаваныя, з тым каб арганізацыя магла падабраць падтрымку і суправаджэнне з улікам індывідуальных патрэбаў. Яны таксама могуць быць перагледжаны ў ходзе кантактаў арганізацыі з пацярпелым, і тады падтрымка павінна быць скарэктавана адпаведным чынам.

## Задавальненне патрэбаў пацярпелых з дапамогай механізмаў перанакіравання

Спектр патрэбаў пацярпелых шырокі і разнастайны, і часцяком арганізацыя, якая займаецца дакументаваннем, не валодае неабходнымі рэсурсамі для задавальнення ўсіх патрэбаў пацярпелых. Гэта асабліва актуальна ў выпадках масавых парушэнняў, калі пацярпела вялікая колькасць людзей. У выніку, ключавое значэнне мае распрацоўка надзейных каналаў перанакіравання для забеспячэння доступу да спецыялізаваных сістэм падтрымкі, здольных задаволіць гэтыя патрэбы. Надзейныя сістэмы перанакіравання таксама павышаюць патэнцыял арганізацый, якія займаюцца дакументаваннем, у плане доступу да больш шырокіх супольнасцяў пацярпелых, якія, магчыма, ужо знаходзяцца ў кантакце з пэўнымі крыніцамі падтрымкі. Неад›емнай часткай падыходу, арыентаванага на пацярпелых, з›яўляецца накіраванне пацярпелых у службы, якія прадстаўляюць медыцынскую, сацыяльную, псіхасацыяльную і юрыдычную падтрымку, а таксама прытулак.

Накіраванне павінна быць аператыўным і, па магчымасці, простым, каб пазбегнуць сітуацыі, калі пацярпелага перакідваюць з адной арганізацыі ў іншую. Важным першым крокам у стварэнні механізмаў перанакіравання з›яўляецца складанне карты арганізацый, якія працуюць з пацярпелымі, і выяўленне тых з іх, якія могуць прапанаваць якасныя паслугі. Арганізацыі могуць весці актуальныя спісы арганізацый або асоб, якія прапануюць спецыялізаваную падтрымку пацярпелым, для палягчэння аператыўнага перанакіравання.

# Фармаванне метадалогіі з улікам інтарэсаў пацярпелых

## Унутраныя пратаколы

Пратакол уяўляе сабой пісьмовы дакумент, у якім выкладаецца парадак дзеянняў супрацоўнікаў на розных этапах працэсу дакументавання. Пратаколы з›яўляюцца важным інструментам, які забяспечвае падыход, арыентаваны на пацярпелых, на ўсіх этапах дзейнасці, дзякуючы чаму інтарэсы пацярпелых становяцца цэнтральным элементам паўсядзённай працы і следчай стратэгіі арганізацыі. Яны таксама даюць магчымасць арганізацыі весці падрабязны ўлік стандартных працэдур, якіх прытрымліваюцца супрацоўнікі, што можа быць карысным у выпадку, калі сабраная інфармацыя будзе далучана да матэрыялаў крымінальнага судовага разгляду ў будучыні. Нарэшце, пратаколы з›яўляюцца інструментам, які забяспечвае дакладнае выкананне ўсімі супрацоўнікамі, у тым ліку пачаткоўцамі, узгодненых працэдур на розных этапах працы. Пратаколы

павінны быць вычарпальнымі, але лаканічнымі і ахопліваць розныя ролі і працэсы ў рамках працоўных працэсаў арганізацыі.

Унутраныя пратаколы могуць адрозніваца ў залежнасці ад кантэксту і дзейнасці і могуць уключаць:

- Агульны пратакол дакументавання, які ахоплівае этапы ад першага кантакту і сесіі дакументавання да закрыцця справы;[21]
- Пратакол фізічнай і лічбавай бяспекі (напрыклад, меры бяспекі, якія павінны выконвацца супрацоўнікамі, а таксама працэдура тлумачэння рызык пацярпелым і сведкам і меры па іх зніжэнні);
- Пратакол падтрымання або аднаўлення кантактаў з пацярпелымі і патэнцыйнымі сведкамі пасля дакументавання;
- Пратакол анлайн-дакументавання, які адлюстроўвае дадатковыя крокі пры правядзенні анлайн-сесій дакументавання з выкарыстаннем інтэрнэт-платформаў;
- Пратакол дакументавання сэксуальнага і гендарнага гвалту;
- Пратаколы дакументавання выпадкаў з удзелам непаўналетніх.

Пры распрацоўцы пратаколаў важна ўлічваць палітычныя фактары ў рэгіёне, такія як сітуацыя ў галіне бяспекі і формы рэпрэсій, а таксама сацыяльныя і культурныя фактары. Напрыклад, пратаколы па дакументаванні сэксуальнага і гендарнага гвалту павінны ўлічваць стыгматызацыю, звязаную з такімі злачынствамі ў многіх культурах і супольнасцях. Для забеспячэння рэгулярнага абнаўлення пратаколаў у іх варта прапісваць тэрміны правядзення наступнага працэсу іх перагляду. Пратаколы таксама павінны абнаўляцца па меры з›яўлення новай інфармацыі, г. зн. па меры неабходнасці.[22] Таксама важна прызнаць, што па меры прасоўвання працы пратаколы могуць карэктавацца рэгулярна і па меры неабходнасці з улікам новых працэдур або ведаў, набытых у ходзе работы арганізацыі.

## Атрыманне інфармаванай згоды

Інфармаваная згода з›яўляецца важнай часткай дакументавання, паколькі яна дазваляе пераканацца, што пацярпелыя разумеюць мэты працэсу дакументавання і магчымыя рызыкі, звязаныя з удзелам у ім. Этычны абавязак арганізацыі заключаецца ў забеспячэнні інфармаванасці пацярпелых аб розных аспектах працэсу дакументавання і адпраўлення правасуддзя да таго, як яны змогуць прыняць інфармаванае рашэнне аб сваім удзеле. Гэта не фармальнасць, а часта працяглая размова, якая патрабуе часу і цярпення, мэта якой -— забяспечыць поўнае разуменне прадстаўленай інфармацыі пацярпелым.

У некаторых юрысдыкцыях прадстаўнікі павінны выконваць рэгіянальныя і/або нацыянальныя прававыя нормы ў галіне абароны і кіравання дадзенымі. Напрыклад, у ЕС Агульны рэгламент па абароне дадзеных

21 Глабальны кодэкс паводзінаў па зборы і выкарыстанні інфармацыі аб сістэматычным і звязаным з канфліктамі сэксуальным гвалце, (Кодэкс Мурад), 2022 г.
22 Public International Law & Policy Group, 2016 г. *Кіраўніцтва па дакументаванні сур'ёзных парушэнняў правоў* чалавека грамадзянскай супольнасцю.

(GDPR) устанаўлівае правілы апрацоўкі і захавання персанальных дадзеных.[23] Такім чынам, арганізацыі, якія знаходзяцца або ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Еўрапейскага Саюза, абавязаныя збіраць і апрацоўваць персанальныя дадзеныя ў адпаведнасці са сваімі абавязацельствамі паводле GDPR і атрымліваць згоду фізічных асоб на захаванне іх дадзеных у адпаведнасці з гэтымі стандартамі. У выніку працэс атрымання інфармаванай згоды пацярпелага часта будзе ахопліваць абодва элемента: (i) згоду на ўдзел; і (ii) згоду на збор, запіс, захоўванне, выкарыстанне сваіх дадзеных або іх перадачу трэцім асобам.

Апытаныя, у тым ліку пацярпелыя ад катаванняў і іншых парушэнняў правоў чалавека, маглі быць самі ўцягнутыя ў здзяйсненне парушэнняў. У выпадку, калі арганізацыі праводзяць інтэрв›ю з інсайдэрамі, перабежчыкамі або іншымі асобамі, якія могуць быць або былі ўцягнутыя ў парушэнні ці звязаныя з імі, было б мэтазгодна ўключыць у працэс атрымання інфармаванай згоды наступнае. У выпадку патэнцыйнай датычнасці апытанага да крымінальнага злачынства, вы можаце паведаміць яму, што ён не абавязаны казаць нічога пра сваю магчымую датычнасць да якіх-небудзь парушэнняў або злачынных дзеянняў.

Часткай працэсу атрымання інфармаванай згоды нярэдка з›яўляецца вычарпальнае тлумачэнне наступнай інфармацыі:

## Згода на ўдзел у інтэрв›ю

Аўдыё/відэазапіс інтэрв›ю:

- Растлумачце, як будзе выкарыстоўвацца запіс.
- Растлумачце, хто будзе мець доступ да запісу і як ён будзе захоўвацца.
- Атрымайце відавочную згоду на запіс.

Пісьмовая фіксацыя інтэрв›ю:

- Растлумачце, вы будзеце рабіць нататкі або аўдыёзапіс інтэрв›ю.
- Калі вы робіце нататкі падчас інтэрв›ю, патлумачце, што што перад завяршэннем інтэрв›ю вы зачытаеце гэтую інфармацыю сведку, каб ён мог унесці выпраўленні, удакладненні або дапаўненні ў прадстаўленую ім інфармацыю.
- Растлумачце, для чаго могуць быць выкарыстаны гэтыя нататкі.
- Растлумачце, хто будзе мець доступ да нататак і як яны будуць захоўвацца.
- Атрымайце відавочную згоду на вядзенне нататак.
- Дайце пацярпеламу магчымасць праверыць дакладнасць нататак і ўнесці ў іх змены, каб пераканацца, што яны дакладна адлюстроўваюць яго аповед.

23 Рэгламент (EU) 2016/679 (Агульныя правілы абароны дадзеных, GDPR).

Правы пацярпелага падчас інтэрв›ю:

- Растлумачце, што пацярпелы можа адмовіцца адказваць на пытанне, папрасіць перафармуляваць пытанне, задаваць пытанні, зрабіць перапынак, спыніць інтэрв›ю і адклікаць сваю згоду ў любы час.

Магчымыя перавагі і рызыкі ўдзелу ў інтэрв›ю:

- Спытайцеся, ці ёсць у пацярпелага занепакоенасць адносна ўласнай бяспекі.
- Абмяркуйце, ці можна зняць гэтыя занепакоенасці і якім чынам.

Кароткае апісанне інтэрв›ю:

- Паведамце аб меркаванай працягласці інтэрв›ю, запланаваных перапынках, тэмах, якія будуць закранутыя, і тыпах пытанняў, якія будуць зададзеныя ў ходзе інтэрв›ю.

Даступныя псіхасацыяльныя або медыцынскія паслугі:

- Атрымайце відавочную згоду на перадачу пэўнай інфармацыі спецыялісту па псіхасацыяльнай або медыцынскай падтрымцы.

## Згода на захоўванне і перадачу дадзеных

Якая інфармацыя збіраецца ў дадзены момант?

- Растлумачце, якія дадзеныя будуць збірацца, у тым ліку імя, дата нараджэння, адрас і кантактныя дадзеныя, інфармацыя аб інцыдэнтах і падзеях, звязаных з пацярпелым, і інфармацыя аб яго сям›і.
- У адпаведнасці з патрабаваннямі GDPR і лепшай міжнароднай практыкай пацярпелым павінна быць прадастаўлена права на ананімізацыю дадзеных, каб іх нельга было звязаць з канкрэтнымі асобамі. Трэба растлумачыць, якія наступствы для выкарыстання дадзеных у мэтах прыцягнення да адказнасці можа несці гэты выбар.

Як выкарыстоўваецца гэтая інфармацыя?

- Пацярпелыя павінны быць праінфармаваныя аб тым, як выкарыстоўваюцца іх дадзеныя, у тым ліку: для садзейнічання расследаванням, для прадастаўлення пацярпелым інфармацыі і падтрымкі, дзе гэта неабходна і магчыма, а таксама для таго, каб арганізацыя магла звязацца з імі ў будучыні, калі гэта спатрэбіцца.

Як перадаюцца гэтыя дадзеныя?

- Арганізацыі павінны дакладна паведаміць пацярпелым, каму могуць быць перададзены іх асабістыя дадзеныя, г.зн. нацыянальным або міжнародным органам крымінальнага правасуддзя, арганізацыям ААН (такімі як Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ) і Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі або іншыя следчыя органы ААН) або іншым інстанцыям, такім як Еўрапол, якія імкнуцца садзейнічаць доступу да сродкаў прававой абароны і кампенсацыі шкоды, што існуюць цяпер або якія могуць быць створаны ў будучыні.
- Гэта можа таксама суправаджацца прадастаўленнем пацярпелым магчымасці выбіраць, якім арганізацыям могуць быць перададзены іх дадзеныя. Гэта можна зрабіць шляхам выкарыстання ў формах згоды граф для адзнакі магчымых арганізацый або органаў, якім можа быць перададзена інфармацыя.
- Калі пацярпелы дае згоду на перадачу прадстаўленай інфармацыі іншым кампетэнтным органам, супрацоўнікі павінны таксама праінфармаваць яго аб тым, што правілы канфідэнцыйнасці могуць вар›іравацца ў залежнасці ад таго, які орган ажыццяўляе юрысдыкцыю, і што ў ходзе патэнцыйнага судовага разбору інфармацыя можа быць перададзена любым бакам, у тым ліку абароне абвінавачаных. Урэшце, яна можа стаць агульнадаступнай, калі справа будзе перададзена ў суд. Такім чынам, пацярпелыя павінны ведаць, што з моманту перадачы інфармацыі адпаведным органам арганізацыя-дакументатар больш не кантралюе, каму можа быць перададзена гэтая інфармацыя.
- Арганізацыі павінны таксама растлумачыць, што ў выключных выпадках яны могуць быць абавязаны перадаць асабістыя дадзеныя пацярпелых, калі гэтага патрабуе закон.

Як захоўваюцца гэтыя дадзеныя і якія прымяняюцца меры бяспекі?

- Пацярпелыя павінны быць праінфармаваныя даступнай мовай пра тое, як будзе захоўвацца сабраная інфармацыя, у тым ліку звесткі пра тое, якія сістэмы і/ці прылады будуць выкарыстоўвацца арганізацыяй для захоўвання лічбавай інфармацыі.
- Арганізацыі таксама павінны растлумачыць, якія меры бяспекі прыняты для абароны інфармацыі, у тым ліку наяўнасць адпаведных пратаколаў лічбавай бяспекі, доступ да дадзеных і выкарыстання бяспечных сродкаў сувязі.

Як доўга будуць захоўвацца гэтыя дадзеныя?

- Пацярпелым трэба растлумачыць палітыку арганізацыі адносна захоўвання персанальных дадзеных, у тым ліку тэрмін іх захоўвання ў адпаведнасці з GDPR.

Якія правы маюць пацярпелыя ў дачыненні да збору і захоўвання іх дадзеных? Напрыклад, права на:

- Адкліканне згоды, цалкам або часткова
- Запыт доступу да сваіх асабістых дадзеных, г. зн. запыт на інфармацыі пра тое, якія асабістыя дадзеныя, датычныя іх, заходзяцца ў апрацоўцы, і запыт копіі гэтых дадзеных.

- Выпраўленне няпоўных або недакладных асабістых дадзеных.
- Патрабаванне выдалення асабістых дадзеных з файлаў і сістэм арганізацыі
- Пярэчанне супраць выкарыстання асабістых дадзеных у мэтах рэалізацыі законных інтарэсаў арганізацыі.
- Просьбу аб абмежаванні або прыпыненні выкарыстання асабістых дадзеных, напрыклад, для ўстанаўлення іх дакладнасці або высвятлення прычын іх выкарыстання арганізацыяй.
- Прасіць перадаць асабістыя дадзеныя іншай асобе або арганізацыі, напрыклад, спецыялісту ў галіне медыцыны або юрыспрудэнцыі, які прадстаўляе паслугі пацярпеламу.

Неабходна прызначыць кантактную асобу, да якой пацярпелыя змогуць звяртацца з гэтымі пытаннямі. Таксама неабходна даць ім інфармацыю пра тое, як яны могуць падаць скаргу адносна захавання або выкарыстання іх дадзеных (напрыклад, у дзяржаўны орган па абароне даных або ў офіс амбудсмена)

Па магчымасці, супрацоўнікі павінны складаць пратакол атрымання інфармаванай згоды, які можа быць як у пісьмовай форме, з подпісам асобы, якая дае згоду, так і ў форме аўдыё- або відэазапісу. Калі гэта немагчыма, інфармаваная згода павінна быць задакументавана, з датай і подпісам інтэрв›юера.

## Канфідэнцыйнасць

Супрацоўнікі, якія працуюць з асобамі, якія пацярпелі ад катаванняў і іншых парушэнняў правоў чалавека, часта маюць справу з канфідэнцыйнай асабістай інфармацыяй. Канфідэнцыйнасць патрабуе, каб любая інфармацыя, якая дазваляе ідэнтыфікаваць асобу, падрабязнасці аб перажытым або іншая інфармацыя не перадаваліся без згоды пацярпелага. Канфідэнцыйнасць мае на ўвазе не толькі абавязацельства не раскрываць інфармацыю без згоды, але і абарону інфармацыі, прадстаўленай пацярпелымі, ад магчымых парушэнняў бяспекі. Абавязацельства выконваць канфідэнцыйнасць распаўсюджваецца на ўсіх удзельнікаў працэсу дакументавання, у тым ліку перакладчыкаў і іншых пасярэднікаў.[24] Канфідэнцыйнасць не распаўсюджваецца на інфармацыю, атрыманую ў выніку пошуку ў адкрытых крыніцах, якая з›яўляецца агульнавядомай або даступнай, хоць такая інфармацыя па-ранейшаму абараняецца GDPR.

Дакументатары павінны быць праінфармаваныя аб сваёй адказнасці паводле заканадаўства, якое рэгулюе абарону дадзеных у іх юрысдыкцыі. Захаванне правілаў абароны дадзеных з›яўляецца адным з ключавых крокаў для абароны канфідэнцыйнай інфармацыі ад магчымых парушэнняў і рызык бяспекі.

Добрыя практыкі ўключаюць:

- Падтрыманне мер абароны інфармацыі, якая можа прывесці да ідэнтыфікацыі крыніцы, такой як імя, адрас, нумар тэлефона, выявы або любыя іншыя ідэнтыфікацыйныя дэталі.
- Выкарыстанне бяспечных сродкаў і метадаў камунікацыі.

24 Public International Law & Policy Group, 2022 г. *Дакументаванне ў сферы правоў чалавека і мірабудаўніцтва ва Украіне*.

- Бяспечнае захоўванне ўсёй дакументацыі з абмежаваннем доступу да яе толькі ўпаўнаважаным асобам.
- Правядзенне навучання супрацоўнікаў адпаведным кіруючым прынцыпам, палітыкам і мерам забеспячэння канфідэнцыйнасці, каб кожны супрацоўнік, які працуе з канфідэнцыйнай інфармацыяй, разумеў і выконваў устаноўленыя працэдуры.
- Увядзенне пратаколу, якога неабходна прытрымлівацца ў выпадку патэнцыйнага парушэння канфідэнцыйнасці. Напрыклад, калі ўстаноўлена, што пэўны інцыдэнт можа сведчыць пра парушэнне канфідэнцыйнасці, варта прыняць меры для ацэнкі звязаных з ім рызык і неадкладна прыняць меры для іх мінімізацыі.

## Правядзенне бяспечнага інтэрв›ю з улікам інтарэсаў пацярпелых

Кожны чалавек перажывае траўматычныя падзеі па-свойму. Аповед пра перажытае можа мець гаючы эфект для пацярпелых, але ён таксама нясе ў сабе рызыку рэтраўматызацыі. Таму важна знізіць рызыку гэтага. Варта пазбягаць паўторных інтэрв›ю з пацярпелымі, калі ў гэтым няма настойлівай неабходнасці. Таму пры першым кантакце супрацоўнікі павінны спытаць, ці давалі пацярпелыя свае паказанні ў рамках якой-небудзь іншай ініцыятывы па дакументаванні, таму што самі пацярпелыя могуць не згадаць пра гэта. Пацярпелыя могуць пажадаць даць паказанні для ўдзелу ў працэсах прыцягнення да адказнасці, нават калі яны ўжо давалі свае сведчанні, напрыклад, для іншых мэтаў, у прыватнасці, журналістам ці адвакатам. І наадварот, калі дакументатары звяртаюцца да пацярпелага, яны павінны падкрэсліць, што яму будзе прапанавана паўтарыць свае паказанні, калі органы, адказныя за прыцягненне да адказнасці, выкажуць зацікаўленасць у выкарыстанні ягоных паказанняў.

Прыняўшы рашэнне аб правядзенні інтэрв›ю з пацярпелым, супрацоўнікі павінны звесці да мінімуму рызыку рэтраўматызацыі падчас інтэрв›ю. Пацярпелыя ад катаванняў часта адчуваюць поўную або частковую страту кантролю над сітуацыяй. Таму важна знізіць узровень нявызначанасці і як мага больш падрабязна растлумачыць працэс дакументавання (напрыклад, паведаміць пацярпеламу, колькі часу прыкладна зойме інтэрв›ю) на зразумелай яму мове. Акрамя таго, важнае значэнне мае гендарны склад асобаў, якія ажыццяўляюць працэс дакументавання, асабліва падчас размовы з пацярпелымі ад сексуальнага гвалту. Пацярпелым варта даць магчымасць выказаць перавагу адносна таго, каб інтэрв’юер быў пэўнага полу, адначасова праінфармаваўшы іх, што арганізацыя не заўсёды мае магчымасць задаволіць такую просьбу. Добрай практыкай з›яўляецца даць пацярпелым магчымасць прывесці з сабой давераную асобу і/або прапанаваць, каб да інтэрв›ю далучыўся кваліфікаваны псіхолаг.

Эмоцыі могуць перашкаджаць пацярпелым гаварыць пра перажытае. Таксама можа здарыцца так, што некаторыя пытанні выклічуць нечаканую рэакцыю, напрыклад, трывогу або гнеў. Пацярпелыя могуць пачаць вінаваціць сябе за тое, што адбылося з імі ці іх блізкімі. Супрацоўнікі павінны праяўляць спачуванне і нагадваць ім, што парушэнні правоў чалавека, здзейсненыя супраць іх, не з›яўляюцца віной пацярпелых, а вінаватыя ў гэтым тыя, хто здзейсніў гэтыя парушэнні або аддаў загад іх здзейсніць.

Пры падрыхтоўцы да інтэрв›ю варта памятаць аб наступных аспектах, заснаваных на метадалогіі правядзення інтэрв›ю «PEACE»:[25]

Планаванне і падрыхтоўка:

- Правядзіце даследаванне: ці маеце вы доступ да якой-небудзь інфармацыі, якая можа дапамагчы вам скласці ўяўленне пра тое, што перажыў пацярпелы? Напрыклад, калі ў вас ужо ёсць кароткае апісанне таго, што адбылося, атрыманне дадатковай інфармацыі пра кантэкст, у якім адбываліся гэтыя падзеі, а таксама пра агульныя тэндэнцыі парушэнняў можа дапамагчы ў падрыхтоўцы да інтэрв'ю.
- Загадзя падрыхтуйце пісьмовы план: ён павінен ўключаць вызначаныя важныя тэмы, магчымыя пытанні і ацэнку партрэта апытанага.
- Абярыце прыдатнае месца і адпаведную абстаноўку: асаблівую ўвагу варта надаць пацярпелым, якія знаходзяцца ў месцах або сітуацыях, звязаных з высокай ступенню рызыкі. Асабістыя інтэрв'ю варта праводзіць у бяспечным і прыватным месцы -- напрыклад, у офісе арганізацыі або ў іншым памяшканні, дзе выключана магчымасць таго, што размову пачуюць староннія. Таксама важна, каб памяшканне было арганізавана так, каб пацярпелы адчуваў сябе ў бяспецы і псіхалагічным камфорце, і каб яно не выклікала асацыяцый з месцамі, дзе маглі адбывацца катаванні ці іншыя парушэнні. Каб стварыць адчуванне бяспекі і камфорту, памяшканне павінна быць утульным, прасторным і мець натуральнае асвятленне. Расліны, каменьчыкі або іншыя прыродныя, супакаяльныя элементы могуць садзейнічаць стварэнню атмасферы спакою і душэўнай раўнавагі.
- Выбар месца правядзення інтэрв›ю таксама важны пры планаванні онлайн-інтэрв›ю. Пацярпелым можа быць цяжка знайсці канфідэнцыйнае месца, дзе яны могуць свабодна гаварыць (і дзе ёсць стабільнае і бяспечнае падлучэнне да Інтэрнэту), таму гэта варта абмеркаваць з імі загадзя. Інтэрв'ю пажадана праводзіць у адсутнасці іншых асоб (калі толькі прысутнасць суправаджальніка не была папярэдне абмеркаваная), таму варта асцярожна і тактоўна ўдакладніць гэта ў пацярпелага. Інтэрв›юеры павінны звяртаць увагу на магчымыя прыкметы таго, што пацярпелы можа знаходзіцца пад наглядам або кантролем іншых людзей у пакоі.
- Для таго каб пацярпелы адчуў сябе больш упэўнена, у пачатку відэаінтэрв'ю можна паказаць яму памяшканне, у якім знаходзіцца дакументатар, і прадставіць усіх, хто там прысутнічае.
- Інтэрв›юер павінен пераканацца, што ў памяшканні, дзе праводзіцца інтэрв›ю, няма старонніх шумоў і што яго твар добра відаць. Таксама варта пазбягаць цёмнага фону.
- Праца з перакладчыкамі: калі інтэрв›ю праводзіцца з дапамогай перакладчыка, пераканайцеся, што перакладчык праінфармаваны аб кантэксце інтэрв›ю і аб любых пытаннях, якія могуць паўстаць. Перакладчыкам варта нагадаць, што яны прысутнічаюць выключна для перакладу і не ўдзельнічаюць у правядзенні самога інтэрв›ю або ў якім-небудзь іншым узаемадзеянні з апытаным. Акрамя таго, важна, каб уся камунікацыя, што адбываецца ў прысутнасці пацярпелага, цалкам перакладалася, паколькі ўсё, што не тлумачыцца адразу, можа быць успрынята пацярпелымі як ізаляцыя і пагроза.

25 Інстытут міжнародных крымінальных расследаванняў (IICI), навучальны модуль; Для атрымання дадатковай інфармацыі глядзіце, напрыклад, «Следчая група Арганізацыі Аб›яднаных Нацый па прыцягненні да адказнасці за злачынствы, учыненыя ІДІЛ» (UNITAD), 2021 г. *Расследаванні з улікам траўматычнага вопыту: палявое кіраўніцтва*; Truth Hounds, 2023 г. *Ваенныя злачынствы: метадалогія расследавання для НДА* АБСЕ / БДІПЧ FreedomLab, *Інтэрв›юіраванне з улікам траўмаў: навыкі і метады для назіральнікаў*, студзень 2023 г. (даступна на англійскай, украінскай і рускай мовах).

Узаемадзейнічайце і тлумачце:

- Наладзьце даверлівыя адносіны і кантакт з пацярпелым праз цёплы і эмпатычны стыль зносін. Па магчымасці прапануйце выбар і магчымасць прыняцця рашэнняў, напрыклад, дзе чалавек хацеў бы сядзець, ці хоча ён што-небудзь выпіць, адкрыць акно ці ўключыць ацяпленне.
- Сачыце за сваім тонам, пазбягайце празмернай фармальнасці і не задавайце пытанні ў стылі допыту. Таксама важна пазбягаць фармальнай абстаноўкі, напрыклад, садзіцца за стол насупраць адзін аднаго, бо гэта ўзмацняе адчуванне, што інтэрв›юер з›яўляецца асобай, надзеленай уладай. Паводзьце сябе ўважліва і прафесійна, а таксама паспрабуйце даць суразмоўцу пачуццё ўпэўненасці.
- Добра размяркуеце час інтэрв›ю, прадугледзеўшы перапынкі (па жаданні пацярпелага) для адпачынку або наведвання туалета. Аднак не рэкамендуецца рабіць перапынак, калі апытаны знаходзіцца на сярэдзіне аповяду аб асабліва траўматычным досведзе. Інтэрв›юер павінен растлумачыць у пачатку, што апытаны можа зрабіць перапынак у любы час падчас інтэрв›ю, калі яму гэта неабходна.
- Пераканайцеся, што пацярпелыя п›юць дастаткова вадкасці, што таксама можа паменшыць дысацыяцыю падчас інтэрв›ю, і забяспечце апытаным і інтэрв›юерам магчымасць перакусіць і адпачыць падчас інтэрв›ю.
- Растлумачце мэту інтэрв›ю і тое, што яно можа ўключаць у сябе цяжкія пытанні.  Дазвольце пацярпеламу задаць пытанні і/або выказаць магчымыя перасцярогі.
- Растлумачце любое магчымае выкарыстанне інфармацыі ў будучыні і звязаныя з гэтым рызыкі і атрымайце/задакументуйце інфармаваную згоду. Больш падрабязна на гэтую тэму ў раздзеле аб інфармаванай згодзе вышэй.

Аповед і ўдакладненне:

- Збярыце інфармацыю з дапамогай адкрытых пытанняў, папрасіўшы патэнцыйнага сведку апісаць, што з ім адбылося, або расказаць аб канкрэтнай сітуацыі, а затым задайце канкрэтныя пытанні «Хто», «што», «калі», «дзе», «як» і «адкуль вы ведаеце».
- Дайце пацярпеламу магчымасць распавесці сваю гісторыю, выкарыстоўваючы адкрытыя пытанні. Інтэрв›юеры не павінны навязваць апытанаму пэўную структуру інтэрв›ю, бо гэта можа выклікаць у пацярпелых стрэс і сказіць іх аповед пра падзеі. Яны павінны даць пацярпелым магчымасць распавесці сваю гісторыю ў сваім уласным тэмпе і парадку, задаючы дадатковыя пытанні, каб усталяваць храналагічную паслядоўнасць падзей у далейшым ходзе інтэрв›ю.  Закрытыя, сфакусаваныя і прамацвальныя пытанні могуць быць карысныя для стварэння кантэксту і дапамогі сведкам, успаміны якіх пра падзеі і дэталі могуць быць фрагментарнымі праз атрыманую траўму. Калі пацярпелы мае флэшбэк, інтэрв›юер можа задаць пытанне, якое тычыцца кантэксту, каб дапамагчы яму вярнуцца да рэальнасці.
- Будзьце гатовыя да таго, што сведка можа расказаць пра тое, што можа выклікаць у яго пачуццё сораму, напрыклад, аб сэксуальным гвалце або нанясенні шкоды іншым людзям. Будзьце добразычлівыя і спачувайце, дайце час. Задавайце пытанні, калі ёсць прабелы, але дазвольце пацярпеламу самому вырашаць, колькі падрабязнасцяў ён гатовы расказаць. Перад гэтым патлумачце, што адказнасць ляжыць на злачынцы, а не на пацярпелым.

- Заўсёды праяўляйце далікатнасць пры падыходзе да балючых пытанняў, напрыклад, пра страту членаў сям›і, праблемы са здароўем або гвалт. Карысна будзе папярэдзіць далікатнае пытанне фразай, напрыклад: «Цяпер я хацеў бы спытаць вас пра вашу сям'ю…», і пераканацца, што суразмоўца гатовы працягваць размову.
- Інтэрв›юеры не павінны спасылацца на паказанні іншых пацярпелых, сведак або крыніцы. Гэта можа стварыць рызыку для гэтых крыніц, а таксама паставіць пад пагрозу давер паміж супрацоўнікамі і апытаным, бо такое дзеянне сведчыць пра парушэнне канфідэнцыйнасці.

Завяршэнне:

- Падвядзіце вынікі, спытаеце ў апытанага, ці хоча ён, каб яму зачыталі асобныя часткі нататак, зробленых падчас інтэрв›ю, або перадалі іх яму пасля інтэрв›ю.
- Дайце апытанаму магчымасць дадаць або ўдакладніць інфармацыю.
- Растлумачце наступныя крокі і дайце адказы на пытанні, якія засталіся. Па магчымасці, разгледзьце ўсе занепакоенасці, выказаныя апытаным.
- Пры неабходнасці абмяркуйце магчымасць накіравання да арганізацый, якія прапануюць сацыяльна-эканамічную або псіхасацыяльную падтрымку.
- Удакладніце парадак далейшых кантактаў з патэнцыйным сведкам.

Ацэнка:

- Абмяркуйце вынікі з кіраўніком дакументацыйнага аддзелу (або з асобай, якая курыруе дакументацыйны праект), каб разгледзець пытанні або цяжкасці, што ўзніклі падчас інтэрв'ю.
- Улічыце магчымую другасную траўму членаў каманды.
- Праглядзіце і ацэніце атрыманую інфармацыю.
- Вызначце любыя зачэпкі або напрамкі для далейшага расследавання.
- Ацаніце, што прайшло добра, а што можна было б зрабіць лепш падчас інтэрв›ю.

Пры правядзенні інтэрв›ю са сведкамі і пацярпелымі важна памятаць, што ўразлівасць залежыць ад шматлікіх фактараў і яе ступень павінна вызначацца ў індывідуальным парадку. Да фактараў, якія могуць прывесці да падвышанай уразлівасці, адносяцца ўзрост (дзеці і пажылыя людзі), перанесеныя сэксуальныя і гендарныя злачынствы, фізічныя або псіхічныя абмежаванні, ступень цяжкасці катаванняў, працягласць утрымання пад вартай і іншыя фактары.

Дзеці заўсёды лічацца ўразлівымі сведкамі. Апытанне дзяцей, якія пацярпелі ад гвалту, павінны праводзіць толькі супрацоўнікі, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку і маюць досвед працы з дзецьмі.[26] Мадэль «Дом для дзяцей» (Barnhaus) лічыцца перадавой практыкай працы з дзецьмі, якія пацярпелі ад гвалту і сталі яго сведкамі. Яна грунтуецца на комплексным, арыентаваным на інтарэсы дзяцей і міждысцыплінарным падыходзе да дзяцей, якія перажылі гвалт або сталі яго сведкамі.

26 Дадатковую інфармацыю гл. у дакуменце REDRESS, 2021 г. *Практычныя нататкі 6: Праца з дзецьмі, пацярпелымі ад траўмаў.*

# Бяспека

Ацэнка бяспекі пры працы з пацярпелымі

Пацярпелыя, якія бяруць удзел у працы па дакументаванні, непазбежна сутыкаюцца з рызыкамі для сваёй бяспекі, часта звязанымі з рэпрэсіўнымі ўладамі або недзяржаўнымі суб'ектамі, у тым ліку з помстай і пагрозамі ў свой адрас, а таксама ў адрас членаў сям'і і блізкіх. Вельмі важна прымаць меры для мінімізацыі такіх рызык у мэтах бяспекі і дабрабыту як пацярпелых, так і супрацоўнікаў. Для супрацоўнікаў, якія з›яўляюцца грамадзянамі краіны, дзе мелі месца парушэнні, павінны быць прадугледжаны ўзмоцненыя пратаколы бяспекі.

Укараненне эфектыўных працэдур фізічнай і лічбавай бяспекі можа быць працаёмкім працэсам, які патрабуе паэтапнага падыходу і пастаяннага навучання супрацоўнікаў у пытаннях бяспекі і выкарыстання адпаведных інструментаў. Бяспека з›яўляецца абавязкам ўсёй каманды, паколькі невыкананне працэдур бяспекі адным чалавекам можа паставіць пад пагрозу бяспеку пацярпелых і/або супрацоўнікаў. Вельмі важна, каб кожны супрацоўнік ведаў і выконваў адпаведныя працэдуры.[27]

Першачарговай задачай павінна быць правядзенне дбайнай **ацэнкі бяспекі** да пачатку працы з пацярпелымі. У ходзе ацэнкі павінны быць вызначаныя сцэнары ажыццяўлення рызык і распрацаваныя пратаколы кантактаў з пацярпелымі, уключаючы бяспечныя каналы сувязі і спосабы захоўвання дадзеных. Акрамя таго, неабходна вызначыць абставіны, пры якіх дакументатарам варта пазбягаць кантактаў з пацярпелымі з меркаванняў бяспекі.

Улічваючы спецыфічныя рызыкі для пацярпелых, працэс ацэнкі бяспекі павінен быць рэгулярным і пастаянным, што азначае, што пасля правядзення дакантактнай ацэнкі бяспекі кожнае наступнае ўзаемадзеянне павінна ўключаць ацэнку любых фактараў або абставінаў, якія маглі змяніцца ў выніку папярэдніх кантактаў з дакументатарамі. Гэты працэс павінен выходзіць за рамкі канкрэтных узаемадзеянняў з пацярпелымі, напрыклад, ён можа ўключаць выяўленне больш шырокага спектру патэнцыйных пагроз, якія могуць паўплываць на бяспеку пацярпелых, і планаванне мер па іх змякчэнні. Супрацоўнікі павінны таксама ўсведамляць і ўлічваць рызыкі, якія пагражаюць не толькі самім пацярпелым, але і іх сем›ям і больш шырокім супольнасцям.[28]

Задавальненне патрэбаў пацярпелых у галіне бяспекі

Арганізацыям варта стварыць базавы пратакол бяспекі для супрацоўнікаў, задзейнічаных у працы з пацярпелымі, з магчымасцю яго далейшага адаптавання да канкрэтных абставін кожнага асобнага выпадку.

27 REDRESS, 2022 г. *Практычныя нататкі: вядзенне спраў і лічбавая бяспека для стратэгічных судовых працэсаў супраць катаванняў*.
28 Міністэрства замежных спраў і па справах Садружнасці Вялікабрытаніі, 2017 г. *Міжнародны пратакол аб дакументаванні і расследаванні выпадкаў сэксуальнага гвалту ва ўмовах канфлікту*, с. 93.

Крытэры, якія варта ўлічваць пры правядзенні індывідуальнай ацэнкі:[29]

- Індывідуальныя асаблівасці пацярпелага (г. зн. пол, узрост і іншыя фактары, якія могуць стаць падставай для дыскрымінацыі або парушэння правоў, такія як этнічная або расавая прыналежнасць, разумовыя або фізічныя абмежаванні, сэксуальная арыентацыя і гендарная ідэнтычнасць або яе выражэнне, досвед вымушанага перамяшчэння);
- Характар і абставіны злачынства, кантэкст, у якім яно было здзейснена, і адносіны пацярпелага са злачынцам;
- Уласная ацэнка рызыкі пацярпелым;
- Магчымыя сцэнары рызыкі, такія як помста, пакаранне, затрыманне, канкрэтныя рызыкі, звязаныя з паведамленнем аб сэксуальным злачынстве, і іншыя рызыкі ў залежнасці ад кантэксту.

У сувязі з выяўленымі сцэнарамі рызыкі неабходна мець агульнае ўяўленне аб мерах абароны, якія арганізацыя можа прапанаваць пацярпелым, а таксама аб мерах, якія пацярпелыя могуць прыняць самастойна для зніжэння рызык, як фізічных, так і лічбавых (напрыклад, устаноўка опцыі знікнення паведамленняў у Signal). Гэтыя меры варта растлумачыць пацярпелым, пераканаўшыся, што яны разумеюць абмежаванні арганізацыі ў сферы даступнасці мер абароны.

### Лічбавая бяспека

Тры асноўныя складнікі стратэгіі лічбавай бяспекі для арганізацый, якія працуюць з канфідэнцыйнымі дадзенымі пацярпелых, -- гэта прадухіленне, абарона і рэагаванне.[30]

Для абароны канфідэнцыйных дадзеных варта распрацаваць план **прадухіленьня**, каб не дапусціць пагрозы бяспекі пацярпелых у выніку ўцечкі дадзеных. Ён павінен уключаць меры па абароне дадзеных, а таксама план дзеянняў на выпадак уцечкі і меры па змякчэнні наступстваў уцечкі для канфідэнцыйнасці і бяспекі пацярпелых. Супрацоўнікі, якія працуюць з канфідэнцыйнымі дадзенымі, павінны прайсці навучанне па выяўленні лічбавых пагроз і супрацьдзеянні ім.

**Абарона** у дадзеным кантэксце азначае забеспячэнне збору, апрацоўкі і захоўвання дадзеных бяспечным спосабам з мэтай абароны ўсіх асоб, якія ўдзельнічалі ў зборы дадзеных, а таксама асоб, якія фігуруюць у іх, такіх як пацярпелыя і іншыя патэнцыйныя сведкі. Некаторыя ключавыя элементы гэтага:

- Выконвайце працэдуры бяспечнага кіравання дакументамі і іх знішчэння. Інструменты, якія выкарыстоўваюцца для захоўвання канфідэнцыйных дадзеных пацярпелых, павінны адпавядаць неабходным патрабаванням бяспекі.[31]

29 Global Rights Compliance, 2023 г. *Кіраўніцтва па асноўных стандартах расследавання міжнародных злачынстваў ва Украіне.*
30 REDRESS, 2022 г. *Практычныя нататкі: вядзенне спраў і лічбавая бяспека для стратэгічных судовых працэсаў супраць катаванняў*.
31 REDRESS, 2022 г. *Практычныя нататкі: вядзенне спраў і лічбавая бяспека для стратэгічных судовых працэсаў супраць катаванняў*.

- Пераканайцеся, што супрацоўнікі выконваюць правілы бяспекі пры працы з кампутарамі і тэлефонамі, такія як ўстаноўка і абнаўленне антывіруснага праграмнага забеспячэння, выкарыстанне надзейных пароляў, выкарыстанне VPN і шыфраванне інфармацыі, а таксама абарона канфідэнцыйных файлаў з дапамогай пароляў і метадаў двухфактарнай аўтэнтыфікацыі.[32]
- Па магчымасці пазбягайце выкарыстання працоўных прылад у асабістых мэтах і/або асабістых прылад у працоўных мэтах. Калі гэта немагчыма, супрацоўнікі павінны пераканацца, што дадзеныя, звязаныя з дакументаваннем, захоўваюцца ў тэчках, асобных ад асабістых тэчак.
- Наладзьце бяспечныя працэдуры камунікацыі з пацярпелымі, а таксама паміж супрацоўнікамі і знешнімі бакамі. Такія працэдуры павінны ўключаць рэкамендацыі ў дачыненні да онлайн-сустрэч (напрыклад, праверка асобы ўсіх удзельнікаў) і абмену канфідэнцыйнай інфармацыяй праз онлайн-платформы. Для абмену канфідэнцыйнай інфармацыяй супрацоўнікі павінны выкарыстоўваць зашыфраваныя і бяспечныя каналы сувязі, напрыклад Signal або Wire.[33] Пераход на пэўныя каналы сувязі можа быць складаным, калі супрацоўнікі рэгулярна карыстаюцца менш бяспечнымі, але больш звыклымі ў гэтым кантэксце. Гэтую праблему можна вырашыць з дапамогай рэгулярных трэнінгаў па лічбавай бяспецы.
- Дадавайце апавяшчэнне аб канфідэнцыйнасці пры абмене канфідэнцыйнай інфармацыяй па электроннай пошце.[34]

Арганізацыі могуць разгледзець магчымасць заключэння **пагаднення аб абмене інфармацыяй** пры перадачы канфідэнцыйных дакументаў і інфармацыі вонкавым бакам, такім як нацыянальныя органы, следчыя механізмы, упаўнаважаныя ААН, або іншыя органы па забеспячэнні адказнасці, з указаннем катэгорый канфідэнцыйнасці інфармацыі, інструкцый па выкарыстанні пэўных катэгорый дадзеных і працэдуры дзеянняў у выпадку парушэння пратаколу. Гэта можа тычыцца, напрыклад, выпадкаў, калі суб›екты дадзеных далі сваю згоду на выкарыстанне інфармацыі для аналізу, але не для іншых мэтаў, такіх як згадка ў справаздачы або іншым публічным дакуменце.

У выпадку інцыдэнта, звязанага з бяспекай, арганізацыі павінны прыняць меры для вызначэння наяўнасці факту неправамернага доступу да дадзеных. У выпадку пацверджання інцыдэнту неабходна актываваць комплексны план рэагавання на парушэнне бяспекі дадзеных. Ён павінен уключаць такія крокі, як ацэнка тыпу кампраметаваных дадзеных, вызначэнне асоб, на якіх гэта можа паўплываць, і патэнцыйнай шкоды; лакалізацыя парушэння і прадухіленне далейшай страты дадзеных шляхам выдалення закранутай інфармацыі, узмацнення маніторынгу і правядзення аналізу бяспекі лічбавых сістэм; аднаўленне дадзеных з воблачнага сховішча або знешняй рэзервовай копіі для прадухілення страты інфармацыі і забеспячэння бесперапыннасці працы.[35] План рэагавання павінен уключаць імёны адказных супрацоўнікаў і што ім трэба зрабіць ці да каго ім трэба звярнуцца, а таксама сэрвісы, якія неабходна актываваць, напрыклад, аднаўленне дадзеных з воблачнай рэзервовай копіі. Міжсектаральны падыход і гендарныя аспекты.

32 Front Line Defenders. _Дапаможнік па бяспецы: практычныя крокі для праваабаронцаў, якія знаходзяцца ў групе рызыкі_.
33 Electronic Frontiers Foundation, 2020 г. _Сачэнне і самаабарона: камунікацыя з іншымі_ людзьмі.
34 REDRESS, 2022 г. _Практычныя нататкі: вядзенне спраў і лічбавая бяспека для стратэгічных судовых працэсаў супраць катаванняў_.
35 The Hague Humanity Hub, 2024 г. _Кіберустойлівасць для НДА: калектыўная аналітычная праца_.’

Досвед пацярпелых можа значна адрознівацца у залежнасці ад такіх фактараў, як іх гендарная ідэнтычнасць або сэксуальная арыентацыя, класавая прыналежнасць, этнічная прыналежнасць, узрост, фізічныя магчымасці і іншыя ідэнтычнасці або характарыстыкі.[36] Напрыклад, прадстаўнік ЛГБТІК+ супольнасці, затрыманы падчас дэманстрацыі, мог стаць ахвярай катаванняў або жорсткага абыходжання як пакарання за ўдзел у пратэстах, але таксама мог сутыкнуцца з яшчэ больш жорсткім абыходжаннем з боку праваахоўных органаў з-за гамафобіі. Акрамя таго, пол можа быць фактарам, якія ўплываюць на тое, ці звернецца чалавек па прававую дапамогу ды іншыя віды падтрымкі.

Пералічаныя вышэй характарыстыкі з’яўляюцца некаторымі з фактараў, якія могуць уплываць на досвед пацярпелых ад катаванняў, іх аднаўленне і доступ да падтрымкі. Надзвычай важна правесці кантэкстуальны міжсектаральны аналіз, які павінен выкарыстоўвацца для інфармавання і фарміравання падыходу арганізацыі да працэсу дакументавання. Такі аналіз накіраваны на ўлік „розных відаў міжсектаральнай і множнай дыскрымінацыі і ўціску, якія ўзнікаюць у выніку спалучэння розных ідэнтычнасцяў і перасячэння полу і гендару з іншымі прыкметамі“.[37] Вынікі міжсектаральнага аналізу павінны быць па магчымасці ўключаны ў розныя этапы працы арганізацыі, якая займаецца дакументаваннем:

- збор і апрацоўка доказаў і інфармацыі,[38]
- пратаколы,
- аналітычная праца,
- узаемадзеянне з органамі прыцягнення да адказнасці і органамі крымінальнага правасуддзя,
- інфармацыйная дзейнасць і ўзаемадзеянне з пацярпелымі,
- распрацоўка і прадастаўленне паслуг падтрымкі або механізмаў накіравання да спецыялістаў для рэагавання на гэтыя фактары.

Практычныя крокі, якія могуць быць зроблены для ўкаранення міжсектаральнага падыходу ў працу арганізацыі:

- Распрацоўка тэматычных стратэгій на аснове аналізу канкрэтнага кантэксту, які падлягае дакументаванню, і фактараў, што маюць дачыненне да гэтага кантэксту (напрыклад, стратэгіі ў сферы гендарных пытанняў або па працы з дзецьмі).[39] Напрыклад, калі арганізацыя займаецца дакументаваннем кантэксту, у якім сэксуальны гвалт ва ўмовах канфлікту з›яўляецца шырока распаўсюджанай з›явай, тэматычная стратэгія па гендарных пытаннях і сэксуальным гвалце ў сітуацыях канфлікту павінна вызначаць, якім чынам арганізацыя плануе выяўляць і ўзаемадзейнічаць з найбольш закранутымі катэгорыямі пацярпелых, якія могуць знаходзіцца ва ўразлівым становішчы, а таксама як можа быць аказана падтрымка такім пацярпелым.

36 Impunity Watch, 2019 г. *Кіруючыя прынцыпы трансфармацыйнага пакрыцця шкоды пацярпелым ад сэксуальнага гвалту.*.
37 Еўрапейскі інстытут па пытаннях гендарнай роўнасці, *гласарый і тэзаўрус*.
38 Міжнародны, бесстаронні і незалежны механізм (IIIM): *Гендарная стратэгія і план рэалізацыі.*
39 Выступ Міжнароднага, бесстаронняга і незалежнага механізму (IIIM) на семінары REDRESS па падыходзе, арыентаваным на пацярпелых, снежань 2022 года.

- Занясіце элементы міжсектаральнага падыходу ў пратаколы дакументавання. Напрыклад, пераканайцеся, што пратаколы інтэрв›ю ўлічваюць канкрэтныя праблемы, з якімі могуць сутыкнуцца пэўныя групы пацярпелых.
- Уключыце міжсектаральны падыход і гендарныя аспекты ў рэгулярнае планаванне і дзейнасць па аналізе атрыманага досведу.
- Пры наладжванні партнёрскіх адносін дзейнічайце ў каардынацыі з арганізацыямі, якія займаюцца праблемамі такіх груп, як ЛГБТІК+, дзеці, асобы з інваліднасцю і іншыя. Выявіце іх канкрэтныя патрэбы і адпаведным чынам скарэктуйце сваю дзейнасць, каб забяспечыць доступ усіх груп да паслуг, якія вы прадастаўляеце.
- Правядзіце навучанне ўсіх супрацоўнікаў па пытаннях інтэрсекцыянальнасці і гендарнай праблематыкі.

## Планаванне ўстойлівага захоўвання і кіравання дадзенымі пасля завяршэння этапу актыўнага дакументавання.

Хаця інтэрв’ю з пацярпелымі і сведкамі з’яўляюцца асновай дакументацыйных праектаў, пасля іх завяршэння неабходна выканаць шэраг іншых функцый. Да іх адносяцца:

### Захоўванне дадзеных і матэрыялаў

Арганізацыі, што займаюцца дакументаваннем, могуць захоўваць і апрацоўваць вялікія аб’ёмы дакументаў, доказаў, дадзеных і іншых матэрыялаў у розных фарматах, якія патрабуюць пастаяннага абслугоўвання і надзейнага захавання. Арганізацыі, якія займаюцца такой працай, павінны пакрываць выдаткі на базы дадзеных і лічбавую бяспеку, а таксама забяспечыць наяўнасць супрацоўнікаў, якія прайшлі навучанне па абслугоўванні баз дадзеных.

### Кіраванне доступам да дадзеных і апрацоўка запытаў

У залежнасці ад місіі і палітыкі арганізацыі, што ажыццяўляе дакументаванне, доступ да сабранай інфармацыі павінен прадастаўляцца нацыянальным органам па забеспячэнні адказнасці, судам і міжнародным інстытуцыям (у галіне правоў чалавека). Гэта патрабуе адкрыцця доступу да матэрыялаў, усталявання кантактаў з патэнцыйнымі сведкамі, праверкі сапраўднасці згоды, кіравання перадачай адпаведнай інфармацыі і аказання аналітычнай або юрыдычнай падтрымкі.

Калі функцыі правядзення інтэрв›ю і апрацоўкі дадзеных выконваюцца рознымі арганізацыямі або групамі, неабходна каардынаваць працэсы і пратаколы.

Калі дадзеныя архівуюцца на працяглы тэрмін, варта захоўваць інстытуцыйную гісторыю дакументатарскай арганізацыі і фактычны і прававы кантэкст, у якім яна працавала.

Падтрыманне сувязі з пацярпелымі і патэнцыйнымі сведкамі

У некаторых выпадках арганізацыі, што займаюцца дакументаваннем, могуць быць адзіным кантактам для пацярпелых у пытаннях прыцягнення да адказнасці за злачынствы, здзейсненыя супраць іх, таму пацярпелыя павінны мець магчымасць звязацца з арганізацыяй, каб даведацца пра ход працэсу, актуальныя разбіральніцтвы альбо выказаць свае занепакоенасці. У ідэале пацярпелыя павінны быць інфармаваныя аб ходзе разглядаў па іх справах.

Вельмі важна захаваць здольнасць аказваць, наколькі гэта магчыма, псіхасацыяльную падтрымку пацярпелым і сведкам або мець для гэтай мэты актуальныя і дзейсныя механізмы перанакіравання. Улічваючы доўгатэрміновыя наступствы траўмаў, перажытых ахвярамі катаванняў, гэты аспект застаецца актуальным на працягу многіх гадоў пасля падзеяў.

Для забеспячэння належнага выканання вышэйзгаданых функцый арганізацыям, якія працуюць з пацярпелымі ў мэтах дакументавання злачынстваў, варта належным чынам планаваць свае дзеянні пасля заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў. Па-першае, варта вызначыць, хто можа працягваць выконваць асноўныя функцыі па вядзенні і захоўванні дадзеных. Гэта можа стаць складанай задачай для арганізацый грамадзянскай супольнасці, улічваючы неабходнасць забеспячэння дастатковых рэсурсаў нягледзячы на змяненне прыярытэтаў донараў. Можна разгледзець варыянт перадачы асноўных функцый надзейнаму партнёру з ліку органаў ААН або грамадзянскай супольнасці. У гэтым выпадку супрацоўнікі, якія прымаюць на сябе асноўныя функцыі, павінны прайсці адпаведную падрыхтоўку да даты перадачы паўнамоцтваў.

# Абарона ад другаснай траўмы

Працоўны кантакт з траўмуючымі гісторыямі і матэрыяламі з’яўляецца часткай паўсядзённай дзейнасці тых, хто займаецца дакументаваннем катаванняў і іншых міжнародных злачынстваў. Без належных мер прафілактыкі і рэагавання ўздзеянне траўматызуючых фактараў можа прывесці да псіхалагічнай шкоды, такой як вікарная траўма, прафесійнае выгаранне і другасны траўматычны стрэс. Перажыванне эмоцый і рэакцый, характэрных для гэтых станаў, не з›яўляецца праявай асабістай слабасці, а нармальнай рэакцыяй на цяжкасці такой працы. Варта разгледзець адпаведныя меры прафілактыкі і рэагавання на ранніх этапах планавання .[40]

Другасная траўматычная стрэсавая рэакцыя( ДТСР), вікарная траўма і прафесійнае выгаранне могуць быць прамым следствам працы з траўмаванымі людзьмі. Сімптомы ДТСР падобныя да перажыванняў саміх пацярпелых: пачуццё адчужанасці, парушэнні сну, цяжкасці з канцэнтрацыяй увагі, павышаная насцярожанасць, надакучлівыя ўспаміны пра траўматычныя падзеі і імкненне пазбягаць сітуацый або дзеянняў, здольных выклікаць такія ўспаміны. Вікарная траўма таксама звязана з прамым або ўскосным уздзеяннем траўмы, аднак уяўляе сабой назапашаны, працяглы стан, які можа паўплываць на асабістыя перакананні і светапогляд спецыяліста. У адрозненне ад гэтага, прафесійнае выгаранне з’яўляецца вынікам хранічнага працоўнага стрэсу, а не траўматычнага ўздзеяння, і выяўляецца ў пачуцці знясілення, неэфектыўнасці, цынізму і адчужанасці ад сваёй працы.[41]

Важна, каб супрацоўнікі ведалі, як распазнаваць прыкметы гэтых станаў, каб пры неабходнасці магчы звярнуцца па прафесійную дапамогу. Сістэматычнае адсочванне свайго псіхалагічнага стану і эмацыянальных рэакцый дапаможа дакументатарам і іншым спецыялістам, што знаходзяцца ў зоне рызыкі, своечасова выяўляць прыкметы траўмы і адрозніваць іх ад звычайнага стрэсу.[42]

Рызыка значна ўзрастае для супрацоўнікаў, якія маюць уласны траўматычны досвед або асабіста звязаныя з кантэкстам, у якім былі зафіксаваныя парушэнні.[43] Арганізацыі павінны імкнуцца зніжаць уразлівасць да ўздзеяння траўматызуючых фактараў, прапаноўваючы супрацоўнікам падтрымку і навучаючы іх распазнаваць сімптомы, што ўзнікаюць у выніку такога ўздзеяння.

Прафесійная псіхалагічная дапамога з›яўляецца важнай часткай стратэгіі забеспячэння дабрабыту супрацоўнікаў у арганізацыі, якая дакументуе сур›ёзныя парушэнні правоў чалавека. Пры з›яўленні сімптомаў вікарнай траўмы, выгарання або другаснага траўматычнага стрэсу супрацоўнікам можа спатрэбіцца прафесійная псіхалагічная дапамога для пераадолення гэтых праблем.

40 Следчая група Арганізацыі Аб›яднаных Нацый па забеспячэнні прыцягнення да адказнасці за злачынствы, учыненыя ІДІЛ (UNITAD), 2021 г. *Расследаванні з улікам траўмы: палявое кіраўніцтва*.
41 Следчая група Арганізацыі Аб›яднаных Нацый па забеспячэнні прыцягнення да адказнасці за злачынствы, учыненыя ІДІЛ (UNITAD), 2021 г. *Расследаванні з улікам траўмы: палявое кіраўніцтва*.
42 Там жа.
43 УВКПЧ ААН, 2011 г. *Кіраўніцтва па маніторынгу правоў чалавека (перагледжанае выданне)*.

# Заключэнне

У гэтым кіраўніцтве мы імкнёмся данесці да ініцыятыў, што займаюцца дакументаваннем, перадавы досвед і ўрокі, вынесеныя з падыходу, арыентаванага на пацярпелых, да дакументавання катаванняў і іншых сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека. Такія намаганні маюць вырашальнае значэнне для захавання доказаў катаванняў і іншых сур›ёзных парушэнняў правоў чалавека і забеспячэння таго, каб у будучыні вінаватыя былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці, а пацярпелыя маглі дамагчыся правасуддзя і кампенсацыі шкоды.

Улічваючы, што працай па дакументаванні займаецца шырокае кола суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, ад невялікіх ініцыятыў да буйных грамадскіх арганізацый або кааліцый, да рэкамендацый, змешчаных у гэтым Кіраўніцтве, варта падыходзіць з улікам рознага ўзроўню рэсурсаў і магчымасцяў, якімі валодаюць ініцыятывы ў розных умовах. У гэтым Кіраўніцтве прадстаўлены падрабязныя рэкамендацыі адносна таго, як арганізацыі грамадзянскай супольнасці і іншыя ініцыятывы па дакументаванні могуць весці сваю дзейнасць з улікам інтарэсаў пацярпелых, з разуменнем траўматычнага досведу і на аснове комплекснага падыходу. Пры гэтым рэалізацыя выкладзеных прынцыпаў не абавязкова патрабуе значных фінансавых выдаткаў. Гэта асабліва важна ў кантэкстах, дзе адсутнасць дакументавання ставіць пад пагрозу права пацярпелых на правасуддзе, паколькі інфармацыя і доказы аб парушэннях могуць быць страчаны назаўсёды. Укараненне падыходу, скіраванага на пацярпелых, у працэс дакументавання — гэта працяглы і паступовы працэс. Мы спадзяёмся, што дадзенае Кіраўніцтва будзе служыць практычным арыенцірам для крокаў у гэтым напрамку.

International Accountability Platform for Belarus

**Вокладка: аўтар Кася Будзько**
Ілюстрацыя маладой жанчыны ў турме, створаная беларускай мастачкай, былой палітзняволенай Касяй Будзько.

## Пра Платформу IAPB

Платформа IAPB -- гэта кааліцыя незалежных беларускіх і міжнародных няўрадавых арганізацый, якія аб'ядналі намаганні для збору, кансалідацыі, праверкі, захавання і аналізу доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія падпадаюць пад катэгорыю злачынстваў па міжнародным праве, меркавана здзейсненых беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх.


**iapbelarus.org**

**internationalaccountabilityplatformforbelarus**

**iapbelarus.org**

**iapb@dignity.dk**